Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая газэта

АЎТОРАК
2 лютага 1932 г.
№ 26 (3415)

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: Перадавы—Разгарнуць пераклічку-спаборніцтва перадавых раёнаў.

XVII УСЕСАЮЗНАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ. Спрэчкі па дакладу т. Арджанікідзе.

АБ ЛЕНІНІЗЬМЕ. Даклад А. С. БУБНОВА на траўурным пасяджэньні, прысьвечаным VIII гадавіне сьмерці Ул. І. Леніна.

XIV ЗЬЕЗД КП(б)Б. Справаздача ЦКК КП(б)Б. Даклад т. КАЛІНІНА.

Пераклічка спаборніцтва перадавых раёнаў—справа ўсіх саветаў БССР. (4-я стар.). Поўнае ўжываньне 6-ці ўмоў т. Сталіна гарантуе пасьпяховае выкананьне фінансавага пляну. (4-я стар.).

ЗА МЯЖОЙ: Японская ваеншчына «гаспадарыць» у Шанхаі.

Гадавіна гістарычнай прамовы тав. СТАЛІНА аб аўладаньні тэхнікай. (1-я старонка).

РАЗГАРНУЦЬ ПЕРАКЛІЧКУ спаборніцтва перадавых раёнаў

Усесаюзная вытворчая пераклічка-спаборніцтва перадавых раёнаў СССР, якая праводзіцца «Известиями», ставіць перад сабой задачу шырокай падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі і далейшай барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Спаборніцтва перадавых раёнаў зьяўляецца толькі часткай той вялікай работы, якая павінна быць разгорнута цяпер-жа для падрыхтоўкі 3-й калгаснай вясны.

Валізарныя посьпехі калектывізацыі сельскай гаспадаркі за 3-ці гадоў, пацігодкі, посьпехі сацыялістычнай прамысловасьці, якія падводзяць магутную матэрыяльную базу пад сельскую гаспадарку, паставілі цэнтральнай задачай дню барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Цэнтральнай задачай на сучасным этапе калгаснага будаўніцтва, зьяўляецца якаснае палепшаньне работы існуючых і нанова арганізаваных калгасаў. Гэта значыць, што барацьба за ажыцьцяўленьне пасьці ўмоў тав. Сталіна ў рабоце калгасаў павінна стаць яшчэ больш упартай. Неабходна пакончыць з абязьлічкай, склаўшы пэрсанальную адказнасьць за захаваньне калгаснай маёмасьці і рабочай жывёлы. Больш чымся калі небудзь, праводзячы падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі,—неабходна ў цэнтр усёй работы паставіць правільную арганізацыю калгаснай працы, правільна скарыстоўваць рабочую сілу і весьці правільны вучот яе.

Баявой задачай зьяўляецца поўнае заканчэньне ўсіх загатовак у калгасах і аднаасобным сэктары. У бліжэйшыя дні павінна быць закончана канчатковае разьмеркаваньне ўраджаю ва ўсіх калгасах на аснове цьвёрдага прынцыпу разьмеркаваньня прыбыткаў па колькасьці і якасьці затрачанай калгасьнікамі працы.

Усесаюзная вытворчая пераклічка-спаборніцтва, пачатая па ініцыятыве Сінельнікаўскага раёну, накіравана на дзьвёх лініях. На арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, і на арганізацыю веснавой сяўбы. Гэтыя два элементы спаборніцтва найцыснейшей паміж сабою зьвязаны. Падрыхтоўка да веснавой сяўбы павінна праходзіць пры нясупынай работе і штодзённых клопатах аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

БССР рыхтуецца да веснавой пасеўнай кампаніі ва ўмовах нябывалага ўздыму сельскай гаспадаркі. Сацыялістычны сэктар вёскі заняў моцныя пазіцыі. Калгасьнік стаў цэнтральнай фігурай земляробства. 33 МТС сваім трактарным і машынным паркам абслугоўваюць вялізарную пасеўную плошчу калгасных гаспадарак.

З кожным днём расьце тэхнічная ўзброенасьць нашых калгасаў. Гэтыя дасягненьні заваяваны ў выніку ажыцьцяўленьня правільнай ленінскай лініі нашай партыі, у выніку жорсткай барацьбы з апартуністычнымі тэорыямі і практыкай. Аднак, ня трэба забываць, што далейшыя посьпехі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі могуць быць здабыты толькі ў напружанай рабоце і перамозе цалага раду цяжкасьцяй. Ліквідкай практыцы і самацёку павінна быць абвешчана рашучая барацьба. Пасеўная кампанія павінна быць дакладна падрыхтавана і добра арганізавана. У гэтую весну 1932 году трэба засеяць плошчу ў 250 тыс. гектараў у параўнаньні са 115 тыс. у 1931 годзе. Тэхнічнымі [illegible] трэба засеяць ня менш 320.000 гектараў. Капітальныя ўкладаньні ў сельскую гаспадарку ў 1932 годзе складуць 165 млн. руб. Ажыцьцяўленьне такой вялікай праграмы работ патрабуе напружаньня ўсіх сіл і павароту ўсіх зьвеньняў сыстэмы саветаў «тварам да калгасу», перабудовы работы па-новаму і канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва па ажыцьцяўленьні плянаў бальшавіцкай сяўбы.

Раёны, якія ўступаюць у спаборніцтва-пераклічку павінны цьвёрда ўсвоіць, што посьпехі веснавой пасеўнай кампаніі залежаць ад таго наколькі дакладна будуць падрыхтаваны ўсе элемэнты і ўсё кола с. г. работ. У першую чаргу неабходна асвоіць той агратэхнічны мінімум, які забясьпечыць павышэньне ўраджайнасьці, як на зярнёвых, так і тэхнічных культурах. Прыняты севазварот трэба ва што-б та ні стала захаваць. Якасьць насеньня павінна дасягнуць устаноўленых норм. Неабходна мабілізаваць усе мясцовыя віды ўгнаеньняў.

У гэтай рабоце неабходна кіравацца ўказаньнем тав. Молатава аб тым, што «цяпер цэнтр цяжару нашай работы ляжыць не ў галіне пашырэньня пасеўных плошчаў, а ў барацьбе за ўраджай, падняцьце ўраджайнасьці і арганізацыю ўборкі».

Саветы, дэпутацкія групы ў саўгасах і калгасах, увесь савецкі пералік актыў над кіраўніцтвам партыйных арганізацый павінны дабіцца таго, каб пляны пасеўнай кампаніі былі своечасова спушчаны ў нізы, дэталёва разгледжаны і крытычна абгаворваны. Трэба прадставіць кожнаму саэоту жагчымасьць стварыць праўманыя распрацаваныя і строга дыфэрэнцыяваныя пляны веснавой сяўбы. Ні ў якім выпадку ня трэба дапускаць зацяжкі пасеўных тэрмінаў, якія могуць прывесьці да зьнижэньня кандыцыі зярна і ўраджайнасьці. Асаблівую ўвагу трэба абвярнуць на падрыхтоўку цягавай сілы і рамонт дробнага і буйнага інвэнтару.

Веснавая пасеўная кампанія 1932 году, у якой будуць удзельнічаць мільённыя масы, будзе паказам нашых дасягненьняў і гаспадарча-палітычнай магутнасьці сацыялістычнага сэктару вёскі. Таму вялікае значэньне набывае масавая работа, ужываньне сацыялістычных мэтадаў працы і ўдарніцтва. У гэтых адносінах пераклічка-спаборніцтва перадавых раёнаў зьяўляецца магутнай зброяй ўзяты ў мае для справы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы. У сёньняшнім нумары мы чытаем пра перадавы раёны Мсьціслаўскага раёну, які вылучан ЦВК БССР як вядучы раён для ўдзелу ў спаборніцтве. Гэтыя весткі гавораць аб тым, што паміж саветамі і калгасамі Мсьціслаўскага раёну пачынаецца спаборніцтва за лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы, за апраўданьне назвы вядучага раёну. Мсьціслаўскаму раёну неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, на падцягваньне адсталага вучастку лёну, затратовак і на падрыхтоўку веснавой сяўбы. Усе іншыя раёны БССР, гарадзкія саветы, пэрфэрыйныя арганізацыі і ўся пралетарская грамадзкасьць, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі павінны прыступіць да безадкладнага разгортваньня пераклічкі-спаборніцтва.

Усесаюзная вытворчая пераклічка-спаборніцтва перадавых раёнаў павінна стаць пераклічкай-спаборніцтвам усіх бяз выключэньня раёнаў БССР.

ЗА МЯЖОЮ

ЯПОНСКАЯ ВАЕНШЧЫНА „ГАСПАДАРЫЦЬ" У ШАНХАІ

ШАНХАЙ, 31-І. У сувязі з фактычным захопам японскім войскам і валанцёрамі значнай часткі тэрыторыі міжнароднага сэтльмэнту, прылягаючай да Чапэі, адбываюцца шматлікія канфлікты паміж японскімі вайскімі часьцямі і паліцыяй сэтльмэнту, а так сама з амэрыканскімі і ангельскімі патрулямі.

На працягу ўчарайшняга дня японцы паступова ваніклі сфэру свайго дзеяньня, захапляючы тэрыторыі, якія ахоўваюцца вайскімі часьцямі іншых дзяржаў, поўнасьцю выкідваючы японцаў і робячы вобыск нават паліцэйскіх чыноў сэтльмэнту. Паліцыя сэтльмэнту не дазвуляецца ў тыя раёны, якія заняты японцамі. Амэрыканскія патрулі арыштавалі 4 японскіх узброеных валанцёраў, якія заехалі на «амэрыканскую» тэрыторыю. Некаторыя валанцёры захапілі нават паліцэйскія вучасткі і пасьля толькі з вялікімі цяжкасьцямі былі вызваны адтуль ангельскай паліцыяй.

Пэўны час становішча было такое сур'ёзнае, што муніцыпалітэт замежнага сэтльмэнту прадпісаў замежнай паліцыі пакінуць свае пастарункі. Уся ўлада ў гэтых раёнах перайшла да японцаў, якія літаральна тэрарызуюць кітайскае і нават чужаземнае насельніцтва. Улада замежнага сэтльмэнту прад'явіла консульскаму корпусу (які ўначальвае амэрыканскі консул) пратэст супроць гэтых дзеяньняў японскай улады.

У сучасны момант паліцыя сэтльмэнту прыступіла да разбраеньня японскіх валанцёраў. Некалькі куль, пушчаныя японскімі валанцёрамі, трапілі ў двор ангельскага консульства ня прынёсшы шкоды.

Цэлыя кварталы Шанхаю абернуты ў пажарышча

ШАНХАЙ, 31-І. Паводле газэтных весткі, японцы страцілі забітымі і параненымі, у Шанхаі 350 чалавек. Колькасьць ахвяр, нанесеных кітайцамі не падаецца вучоту. Апошнія 40 гадзін ба рацьбы супроць японцаў вядуць раскіданыя дробныя групы, а таксама па особныя салдаты кантонскай армії і мясцовага насельніцтва, якія абстрэльваюць японскія пазіцыі з дамоў, з дахаў, з-за вугла. Будучы схаванымі гэтыя стральцы прыносяць японцам вялікія страты і затрудняюць японскія апэрацыі. Японцы ўтвараюць вобыскі па дамох, усіх вуліцах, растрэльваюць кожнага падазронага, спальваюць дамы і цэлыя кварталы.

Японская флятылія запаўняе кітайскія воды

ШАНХАЙ. 31-І. Сёньня ў Шанхай прыбылі японскія авіяматкі «Каго» і «Хошо» сумесна з значным лікам іншых ваенных суднаў. Паведамляюць, што авіяматкі маюць у сябе на борце 75 самалётаў, уключаючы магутныя бамбавозы «Кошіна» тыпу.

Японскія крэйсэры прыбылі у Нанкін

ТОКІЕ. 31-І. Газэта «Ніці-Ніці» паведамляе з Куре аб тым, што 2-й тарпэдны флётыльі дадзен загад накіравацца ў Шанхай. У флётылью ўваходзіць крэйсэр «Шэнэу» і 7 эсьмінцаў.

ШАНХАЙ. 31-І. Чатыры японскіх крэйсэры прыбылі ў Нанкін.

Канцэнтрацыя японскага войска

ТОКІЕ. 31-І. Паводле паведамленьня з японскіх крыніц, учора ў Шанхаі працягваліся сутычкі паміж японскім дэсантам і кітайскім войскам.

Мела месца таксама, як паведамляюць гэтыя крыніцы, перастрэлка паміж кітайскім войскам і брытанскімі вайсковымі часьцямі. Галоўнакамандуючым японскіх сіл у Шанхаі прызначаны былы ў Токіё намесьнік начальніка морскага штабу Хакутака.

У камунікэ, апублікаваным морскай японкай уладай у Шанхаі, зазначаецца, што ў сучасны момант у Шанхаі сканцэнтравана 5 тыс. японскіх маракоў.

Гамінданаўская кліка ўцякае з Нанкіну

ШАНХАЙ, 31-І. Карэспандэнт «Юнайтэд прэс» паведамляе, што **нанкінскі ўрад пераводзіць сталіцу ў Лоян** (буйны горад правацыі Хенань), уцякючы ад наступленьня японскага войска на Нанкін. Па чутках Чан Кай-шы ўжо выехаў у Лоян.

***

ШАНХАЙ, 31-І. Увесь нанкінскі ўрад, за выключэньнем вайсковага міністра Хо Ін Ціна і міністра замежных спраў Вень Кана, выехаў у Лоян.

Старшыня нацыянальнага ўраду Лінь Сянь Ван Цзін Вэй апублікаваў заяву, у якой гаворыцца, што нанкінскі ўрад пакінуў чакаў, спадзяючыся на тое, што дзяржавы падтрымаюць справядлівасьць. Ня гледзячы на гэта японскае войска ўпэрвалася ў Шанхай, для таго, каб заваяваць Кітай.

Японцы адначасова пасылаюць ваенныя караблі ў Нанкін.

Аднак на гэта ўрад ня можа пайсьці і ня ўступіць ніводнага кавалка сваёй тэрыторыі.

Адначасова дэклярацыя знарачаецца да дзяржаў, якія падпісалі дагавары з Кітаем, просячы захаваць усеагульны спакой.

***

ШАНХАЙ, 31-І. Ня гледзячы на ранейшыя паведамленьні, высьвятляецца, што ніякага войска нанкінскі ўрад не пасылаў у Шанхай. Чан Кай-шы байцца, што войска знаходзіцца пад вялікім уплывам групы Сунь По. Усё войска з Нанкіну выведзена ў Лоян. Абсталяваньне шанхайскага і нанкінскага арсэналаў вывезены таксама ў Лоян. Перавоз ураду ў Лоян вельмі падобны на ўцяканьне.

„Амэрыканскі флёт гатоў абараняць інтарэсы сваіх рэзыдэнтаў"

ВАШЫНГТОН. 30-І. Вайскова-морскім сілам Злучаных Штатаў, у азіяцкіх водах, дадзен загад падрыхтавацца да эвакуацыі амэрыканскіх грамадзян з Кітаю.

Начальнік апэрацыйнага кіраўніцтва вайскова - марскога міністэрства ПАЗШ адмірал Прат зрабіў наступную заяву: «Амэрыканскі марскі флёт у азіяцкіх водах будзе гатоў эвакуаваць амэрыканскіх грамадзян ці абараніць іх у выпадку, калі становішча абвострыцца да такой ступені, што будзе «перавышаць улада натоўпу».

Вайсковыя сілы ПАЗШ ужываць усе неабходныя крокі для абароны амэрыканскіх грамадзян. Адмірал Прат спасылаўся толькі на тую частку азіяцкай эскадры ПАЗШ, якая знаходзіцца ў сучасны момант у водах, ня ўспомніўшы аб вялізарных марскіх сілах, якія адпраўляюцца 31 студзеня з Калі форніі для манэўраў у Гавайскіх выспаў.

ШАНХАЙ. 10-І. Амэрыканскае консульства ў Нанкіне прапанавала амэрыканскім рэзыдэнтам рыхтавацца да эвакуацыі ў працягу 2-х гадзін пасьля паведамленьня.

„Падрыхтован на ўсякі надзвычайны выпадак"

НЬЮ-ЁРК. Згодна паведамленьня «Нью-Ёрк Таймс» адмірал Лей, камандуючы амэрыканскай эскадрай у складзе 65 караблёў, якая накіроўваецца да Гавайскіх выспаў, заявіў, што яго эскадра цалкам падрыхтавана да ўсяка гадзявычайнага стану, маючы ўсе неабходнае ў колькасьці дастатковай на 2 гады.

Французкі імпэрыялізм у поўнай згодзе з Японіяй

ПАРЫЖ. 31-І. Блізкая да французкага генэральнага штабу газэта «Эко дэ Пары» заяўляе, што японскае камандаваньне ў Шанхаі дзейнічала ў поўнай згодзе з камандаваньнямі ваенных сіл вялікіх дзяржаў. Такім чынам «канфлікт у Шанхаі зусім не японска - кітайскі, а паміж дзяржавамі і Кітаем».

Трамвайшчык Лодзі стойка змагаюцца з фашысцкай зграяй

ВАРШАВА, 31-І. Забастоўка трамвайшчыкаў у Лодзі працягваецца з ранейшай стойкасьцю.

Сёньня ўвечары чакаецца абвяшчэньне забастоўкі рабочых газавага заводу, а заўтра забастоўка рабочых большасьці тэкстыльных фабрык. Не вялікая колькасьць трамваяў, якія падтрымліваюць рух пры дапамозе штрэйкбрэхераў, ходзяць пустымі. Бастуючыя трамвайшчыкі зьяўляюцца ў трамвайныя паркі і перашкаджаюць рабоце штрэйкбрэхераў. Учора ў 11 гадзін вечара павінен быў адбыцца агульны сход бастуючых трамвайшчыкаў, скліканы забастовачным камітэтам, аднак, улада сход забараніла.

Крывавая лапа фашысцкіх катаў пагражае жыцьцю 14 рабочых

ВАРШАВА, 31-І. Пракурор акруговага суду ў Катавіцах патрабуе перадачы палявому суду 14 рабочых, арыштаваных у часе дэманстрацыі беспрацоўных у Парушоўцы, якая справаджалася крывавымі сутычкамі з паліцыяй.

Рэвалюцыйны рух у Індыі расьце і шырыцца

ЛЁНДАН. 31-І. Сёньня ў Бамбэю прыбывае камісія лёрда Лоціена для працягваньня работ у канфэрэнцыі «круглага стала» «па вывучэньню будучай канстытуцыі Індыі».

У сувязі з гэтым, па ўсёй Індыі пашыраецца масавы антыангельскі рух. Учора ўсю ноч у Бамбэі адбываліся масавыя дэманстрацыі. У часе шматлікіх сутычак з паліцыяй, апошняя правяла шмат арыштаў. На галоўных вуліцах гораду гарэлі дзесяткі вогнішчаў, на якіх прыхільнікі нацыянальнага кангрэсу палілі ангельскія тканіны і вопратку. Паліцыя не адзін раз атакавала дэманстрантаў, але натоўпы дэманстрантаў, пасьля гэтага зноў зьбіраліся. У ангельцаў, праяжджаючых у аўтамабілях дэманстранты кідалі каменьні.

Як паведамляюць, зараз «пажарныя каманды спрабаваўшыя гасіць вогнішчы і пажары, затрымліваліся барыкадамі, пабудаванымі ўпопярак вуліц».

У Кашміры працягваюцца буйныя ўсхваляваньні. З раду месц паведамляюць аб актыўных выступленьнях сялян, якія адмовіліся плаціць падаткі ўраду і арэндную плату абшарнікам. У селішчы Чакралман паліцыя прабавала адабраць жывёлу ў сялян, якія адмовіліся плаціць зямельныя падаткі. Сяляне сустрэлі паліцыю градам каменьняў. Паліцыя ў адказ страляла, забіўшы двух і параніўшы шмат сялян. У раёне Чанмукі і Бсіндэр сяляне разбурылі тэлеграфную лінію.

У паўночна-заходняй правінцыі ў некалькі дзесяткаў кілёмэтраў ад Пешавара працягваецца паўстанне племён супроць ангельцаў. Баявыя добра ўзброеныя атрады апэруюць уздоўж Малакандскай чыгункі, на поўнач ад Пешавара. Атрады плямён абстрэльваюць ангельскія ўмацаваныя пасты і разьведвальныя аэраплены. Брытанская вайсковая ўлада правінцыі выслала ў раён паўстаньня буйную карную экспэдыцыю.

(ТАСС).

Абядненьне пралетарыяту Італіі

Рымскі карэспандэнт «Бэрлінэр Тагеблат» у артыкуле, прысьвечаным Італіі, падае даныя аб заработнай плаце італьянскіх рабочых і аб становішчы беспрацоўных. Заняты італьянскі рабочы зарабляе **73 марыі ў месяц**. Цэны на прадукты і тавары шырокага спажываньня ў Італіі значна **вышэй, чымся ў Нямеччыне**. Італьянскі беспрацоўны атрымлівае ад 27 да 81 пфэнінга дапамогі ў дзень Але **дапамогу атрымлівае толькі адна трэць усяго ліку** (больш 1 млн. у дзень) беспрацоўных.

Сельскагаспадарчы рабочы зарабляе 24-32 пфэнінгі ў дзень, с. г. работніца—13-20 пфэнінгаў. Заработак дзяржаўнага чыноўніка—1.275 марак у год, вышэйшага чыноўніцтва—2.300 марак. Вельмі цяжкое становішча асоб вольных прафэсій. «Пралетарызацыя гэтых пластоў,—піша карэспандэнт,—пайшла натолькі-ж далёка, як і ў Нямеччыне».

Гэтыя лічбы жудасныя. Яны даводзяць, што жыцьцёвы ўзровень занятага італьянскага рабочага амаль параўнаўся з жыцьцёвым узроўнем нямецкага беспрацоўнага, які атрымлівае ўразаную надзвычайнымі дэкрэтамі. Сотні тысяч беспрацоўных у Італіі, не атрымліваючых ніякай дапамогі асуджаны літаральна на галодную сьмерць

Гадавіна гістарычнай прамовы тав. Сталіна „аб аўладаньні тэхнікай"

Усім гаспадарчым, прафэсыяльным і камсамольскім арганізацыям, усім добраахвотным тэхнічным таварыствам

Па ініцыятыве раду заводаў, саветаў навуковых таварыстваў і рэдакцый газэт, гадавіна гістарычнай прамовы тав. Сталіна 4-га лютага «аб аўладаньні тэхнікай» адзначаецца правядзеньнем ў лютым масавага агляду барацьбы за аўладаньне тэхнікай на прадпрыемствах. Наркамат цяжкай прамысловасьці, УсеЦСПС, ЦК УсеЛКСМ і ўсесаюзнае таварыства «За аўладаньне тэхнікай» прапануюць усім гаспадарчым, прафэсыянальным і камсамольскім арганізацыям безадкладна ўключыцца ў агляд і правесьці яго на працягу лютага пад кутом праверкі стану тэхпрапаганды і аўладаньня тэхнікай. Канкрэтна, у часе агляду неабходна правесьці:

1. Выкананьне дырэктывы ЦК УсеКП(б) ад 5 жніўня 1931 году аб тэхпрапагандзе і стварэньні масавай тэхнічнай грамадзкасьці («Ніто», «Зот», т-ва вынаходнікаў і г. д.).

2. Стан масавай тэхвучобы і тэхмасавай работы на прадпрыемствах.

3. Як увязваецца тэхпрапаганда з барацьбой за выкананьне праграмы, павышэньне прадукцыйнасьці працы, паляпшэньне якасьці прадукцыі, вызваленьне ад чужаземнай залежнасьці ў тэхнічных адносінах. Максымальнае скарыстаньне творчай ініцыятывы рабочых, спэцыялістаў, гаспадарнікаў.

4. Стан вучобы гаспадарнікаў без адрыву ад вытворчасьці.

5. Стварэньне тэхпляну на кожным прадпрыемстве. Агляд павінен выявіць, што зроблена па ўсіх гэтых напрамках на кожным паасобным вытворчым вучастку, падагуліць лепшы вопыт для перанясеньня яго на ўсе прадпрыемствы, намеціць канкрэтныя мэрапрыемствы для далейшай работы і поўнасьцю ліквідаваць існуючую недаацэнку тэхпрапаганды з боку значнай часткі гаспадарчых органаў і прафсаюзаў.

Побач з агульнымі формамі правядзеньня масавага агляду (стварэньне праверачных брыгад, тэхпропаў, тэхканфэрэнцый, выставак, экскурсій, кіно і г. д.), а таксама масавай мабілізацыяй грамадзкасьці вакол агляду, наркам цяжкай прамысловасьці, УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ прапануюць:

1. Абвясьціць дзень 4 лютага Усесаюзным днём тэхнікі і ў гэты дзень правесьці ва ўсіх прадпрыемствах спэцыяльныя сходы рабочых, прысьвечаныя агляду з падвядзеньнем на іх гадавых вынікаў работы па аўладаньні тэхнікай.

2. Арганізацыя агляду павінна быць праведзена пры абавязковым захаваньні адзінства дзеяньняў усіх мясцовых арганізацый (тэхпропаў, гаспадарчых аб'яднаньняў і прадпрыемстваў, камсамольскіх арганізацый, прафэрганізацый, «НІТО», «ЗОТ», таварыства вынаходцаў і г. д.) шляхам арганізацыі пастаянных нарад пры тэхпропах, гаспадарчых аб'яднаньнях і прадпрыемствах.

3. Вынікі работы па аглядзе неабходна абгаварыць на масавых тэхнічных канфэрэнцыях, якія арганізуюцца ў агульна-заводзкім і раённым маштабе, на якіх павінны быць асабліва падагулены наступныя асноўныя паказьнікі:

а) кантрольныя лічбы ахопу ўсімі відамі масавай тэхвучобы розных катэгорый і кваліфікацый рабочых, ІТР і служачых на 1932 год;

б) складаньне адзінага пляну масавай кампаніі тэхпрапаганды;

в) выпуск тэхнічнай пазыкі вучобы на лініі ІТР і рабочых;

г) плян арганізацыі тэхнічных таварыстваў.

За бальшавіцкія тэмпы ў масавай тэхпрапагандзе!

Нарком Цяжкай прамысловасьці СССР
С. Арджанікідзе.
Сакратар УсеЦСПС
Н. Швэрнік.
Сакратар ЦК УсеЛКСМ
А. Косараў.
Усесаюзнае Таварыства «За аўладаньне тэхнікай».

Новыя перамогі савецкай тэхнікі

КІЕЎ. 29-І. Завод імя Лепсэ дабіўся буйнай перамогі. Ён пачаў вырабляць галоўкі да цыліндраў трактара «Катэрпіллер» якія дагэтуль імпартаваліся.

Калектыў заводу ўзяў на сябе абавязак перад 17-й партканфэрэнцыяй выпускаць штодзённа запасных трактарных частак ня менш чымся на 6.000 руб. Апошнія дні паказалі, што завод гэты абавязак выконвае. Завод выпускае цяпер напрыклад штодзённа 300 поршняў замест 160—170 у нядаўным мінулым.

Кіеўскі завод млынавых машын імя Дзяржынскага, які мае вялікія заслугі ў справе замены імпартных машын савецкімі, да 17-й партканфэрэнцыі дабіўся новай буйнай перамогі, пачаўшы выраблять машыны «Сутонны» па сартыроўцы розных зернавых культур. Гэтыя машыны да сёньня імпартаваліся.

Завод прыступіў да выпуску машын для ахалоджваньня хлеба, якія таксама раней не выраблялісь ў СССР. Завод атрымаў ад Усеукраінскага трэсту хлебапячэньня заказ на 35 такіх машын.

***

Завод «Электраапарат» выпусьціў першы генэратарны масьляны выключацель тыпу МКГ—71—В з разрыўной магутнасьцю у паўтара мільёны кілёват-ампэр, на сілу тока 2.000 ампэр і напружаньня—15 тыс. вольт.

Гэты масьляны выключацель зьяўляецца першым па магутнасьці для самых буйных генэратараў, якія будуюцца ўпяршыню ў СССР. З выпускам гэтага масьлянага выключацеля **Савецкі Саюз дагнаў у высокавольтным апаратабудаўніцтве Нямеччыну і Італію.**

На XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі

Даклад тав. Арджанікідзе аб выніках разьвіцьця прамысловасьці за 1931 год і задачах 1932 году канфэрэнцыя заслухала 30 студзеня. На ранішнім і вячэрнім пасяджаньнях 31 студзеня ішлі спрэчкі па дакладзе тав. Арджанікідзе.

На ранішнім пасяджаньні ў спрэчках выступілі т. т. **Сераброўскі, Любімаў, Лобаў, Гарадзінскі, Пылаеў, Сухамлін, Постышаў, Півавараў і акадэмік Губкін.**

Тав. Сераброўскі сваё выступленьне прысьвечвае пытаньням разьвіцьця каляровай мэталюргіі. Ён падае даныя, якія характарызуюць вялізарны пераварот, зроблены ў гэтай галіне. Там, дзе да гэтага часу ня было ніякай тэхнічнай базы, дзе кірка была ледзь не адзіным посьбітам «механізацыі»,—зараз працуюць магутныя электрастанцыі, самыя ўдасканаленыя мэханізмы.

Нам надзвычайна цяжка было асвоіваць новыя вытворчыя працэсы, але мы гэтыя труднасьці перамаглі.

Тав. Сераброўскі радам прыкладаў ілюструе нашы перамогі ва ўсіх галінах каляровай мэталюргіі. Падкрэсьліваючы ў заключэньне вялізарны размах капітальных укладаньняў у каляровую прамысловасьць (700 млн. руб. у 1932 г.) тав. Сераброўскі высоўвае задачу лепшага скарыстаньня гэтых фондаў падвышэньня якасьці капітальнага будаўніцтва. Каляровая мэталюргія з вузкага месца і тормазу ператворыцца ў помпэніка, будзе ўзбройваць электратэхніку, машынабудаўніцтва, усю сацыялістычную індустрыю.

Наступным у спрэчках выступае тав. Любімаў (нарком лёгкай прамысловасьці). Тав. Любімаў гаворыць аб перспэктывах лёгкай прамысловасьці, аб задачах ўноў створанага наркамату лёгкай прамысловасьці. Вылучэньне лёгкай прамысловасьці на перадавыя пазіцыі сацыялістычнага будаўніцтва зьявілася вынікам рашаючых посьпехаў індустрыялізацыі, усіх дасягненьняў, якія мы маем ў цяжкай прамысловасьці і вынікам калектывізацыі. Тав. Любімаў спыняецца на дасягненьнях і недахопах лёгкай прамысловасьці, на шматлікіх фактах, якія гавораць аб нашых посьпехах у справе вызваленьня ад чужаземнай залежнасьці. Ахарактызаваўшы стан кадраў лёгкай прамысловасьці, і вялікі ніякі процант інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу,—тав. Любімаў у заключэньне гаворыць аб неабходнасьці карэнным чынам зьмяніць адносіны да лёгкай прамысловасьці з боку ўсіх арганізацый і далажам ажыцьцявіць ў лёгкай прамысловасьці 6 умоў тав. Сталіна. Толькі пры напружаньні сіл усёй партыі, рабочае клясы і калгасьнікаў лёгкая прамысловасьць будзе ў стане выканаць ускладзеныя на яе вялізарныя задачы.

Затым слова прадастаўляецца тав. Лобаву (народны камісар лясной прамысловасьці). Ахарактызаваўшы стан лясной прамысловасьці, тав. Лобаў падрабязна спыняецца на перспэктывах яе разьвіцьця. Ён зьвяртае асаблівую ўвагу делегатаў канфэрэнцыі на разьвіцьцё леса-хімічнай прамысловасьці, якая ў нас пакуль-што ў першапачатковым стане. Далей тав. Лобаў зьвяртае ўвагу делегатаў на пытаньні рацыяналізацыі работы ў лесе, лясной прамысловасьці ў цэлым, узьнятьця даходнасьці гэтай галіны гаспадаркі. Тав. Лобаў канчае выступленьне пытаньнем аб укараненьні гаспадарчага разьліку ў лясной прамысловасьці. Толькі пры гэтай умове, — заўважае ён,— у 1-2 гады мы дамажемся таго, што лясная прамысловасьць зробіцца непазнаваемай.

На пытаньнях Урала-Кузьнецкага камбінату падрабязна спыняецца тав. Грызінскі (Заходняя Сібір).

Дзякуючы ленінскаму кіраўніцтву, якое ажыцьцяўляецца ЦК нашай партыі,—пачынае тав. Пылаеў,—(Ленінград) нам удалося ў трэцім годзе пяцігодкі і зразумелая рэч удасца ў чацьвёртым годзе ажыцьцявіць тыя гіганцкія тэмпы, якія мы ўзялі. Тое, што зараз робіцца ў нашай краіне—гэта перабудова геаграфіі ўсёй краіны. 2½ гады таму назад у Хібінах была толькі адна лапарская сям'я ў 5-6 чалавек. Цяпер мы там маем горад у 50.000 насельніцтва. Ня менш хутка растуць і старыя гарады. Пяцігодка ленінградзкай прамысловасьці выканана ў 3 гады.

На задачах украінскай прамысловасьці спыняецца тав. Сухамлін. Украінская прамысловасьць—вугалю дае 63 проц., коксу—89 проц., руды—77 проц. і г. д. Вялізарныя посьпехі, якія мы маем, навочна паказваюць чаго можа дасягнуць краіна пры сацыялістычнай сыстэме. Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы правільнай ленінскай лініі нашай партыі, дзякуючы бальшавіцкаму кіраўніцтву нашага ЦК, у барацьбе супроць апартунізму і гнілога прымірэнцтва мы выканаем гіганцкую праграму апошняга году пяцігодкі.

Пасьля гэтага з вялікай прамовай выступае, сустрэнуты доўгімі воплескамі, сакратар ЦК УсеКП(б) тав. Постышаў.

Затым тав. Півавараў (Паўночны Каўказ) гаворыць аб пляне прамысловасьці Паўночнага Каўказу.

Наступным выступае акадэмік тав. Губкін. XVI зьезд УсеКП(б) прапанаваў фарсаваць геолёга-дасьледчыя работы і падвесьці пад іх матар'яльную базу. Цяпер мы налічваем ўжо 18 геолёга-дасьледчых трэстаў, якія маюць 82 базы, рыхтуецца да адкрыцьця яшчэ 12 баз. Тав. Губкін спыняецца на вялізарнай рабоце, разгорнутай на дасьледваньні Курскай магнітнай аномаліі. Пры ўмове далейшага разгортваньня дасьледчых работ у раёне Курскай аномаліі, мы ў бліжэйшыя часы здолеем паставіць пытаньне аб стварэньні магутнай металюргічнай базы ў самым цэнтры краіны, ля самых старых прамраёнаў. Ня гледзячы на ўсе гэтыя бясспрэчныя дасягненьні, геолёга-дасьледчыя работы ўсё-ж значна адстаюць ад патрабаваньняў прамысловасьці. Адчуваецца недахоп у іх кадрах, асабліва ў высокакваліфікаваных. Мы павінны яшчэ шырэй разгарнуць геолёга-дасьледчыя работы. Наш Саюз зробіцца найбольш багатай краінай у адносінах дасьледчых прамзапасаў карысных выкапняў і мы на аснове выяўленьня магутнай сыравіннай базы здолеем забясьпечыць вялізарныя тэмпы разгортваньня народнае гаспадаркі ня толькі ў другой, але і ў трэцяй пяцігодцы.

Выступленьнем т. Губкіна закончваецца ранішняе пасяджаньне 31 студзеня.

На вячэрнім пасяджаньні працягваліся спрэчкі па дакладзе тав. Арджанікідзе. Выступілі тт. **Талакончаў, Кубак, (Іванава-Вазьнясенская вобласьць), Рудзутак, Бухарын, Мікаян.**

Канфэрэнцыю віталі, па даручэньні Усесаюзнай Акадэміі навук, абавязковы сакратар Акадэміі Навук тав. Волгін, акадэмікі Іёфэ і Курнакоў, якія паведамілі канфэрэнцыі аб работах інстытутаў Акадэміі навук.

1 лютага працягваліся спрэчкі па дакладзе тав. Арджанікідзе

Зьезд міністраў у Парыжы

«Журнал» адзначае, што цяпер у Парыжы сапраўдны зьезд замежных міністраў»:

Венізелос (грэцкі прэм'ер). Зулуета (гішпанскі міністр замежных спраў); Гіка (міністр замежных спраў Румыніі), Залескі (польскі міністр замежных спраў), Бранко, Мушанаў, і Арнэтаянаў (румынскі міністр фінансаў).

Усе яны прыехалі проста з сэсіі фінансавага камітэту Лігі нацый. (З газэт).



АБ ЛЕНІНІЗЬМЕ

ДАКЛАД тав. БУБНОВА НА ТРАУРНЫМ ПАСЕДЖАНЬНІ, ПРЫСЬВЕЧАНЫМ VIII ГАД. ВІНЕ СЬМЕРЦІ Ул. І. ЛЕНІНА*)

I. Аб міжнародным характары і міжнародным значэньні ленінізму

Таварышы, кожны год будаўніцтва сацыялізму і клясавай барацьбы рабочых усяго сьвету прыносіць нам новыя доказы, што вялікае вучэньне Леніна зьяўляецца магутным фактарам рэвалюцыйнага кіраўніцтва і навуковага прадбачаньня.

Ленін неаднакроць гаварыў, аб тым, што руская рэвалюцыя мае міжнародне значэньне, разумеючы гэта ў самым усебаковым сэнсе гэтага слова. Ленін пастаянна паўтараў і даказваў, што тэорыя і практыка бальшавізму мае міжнароднае значэньне, што «рускі ўзор паказвае ўсім краінам тое-сёе і вельмі істотнае з іх нямінучай недалёкай будучыні». Адсюль выводзіў ён міжнароднае значэньне «савецкай ўлады, а таксама асноў бальшавіцкай тэорыі і тактыкі» [1]).

Ленін сьцьвярджаў, што бальшавізм «стварыў ідэйныя і тактычныя асновы III-га інтэрнацыяналу», што ён «паказаў верны шлях выратаваньня ад жахаў вайны імпэрыялізму», што ён «папулярызаваў на ўвесь сьвет ідэю дыктатуры пралетарыяту»; што ён стварыў «дэмакратыю нязьмерна больш высокую і шырокую, чымся ўсе ранейшыя дэмакратыі сьвету», і што ён пачаў «творчасьць дзесяткаў мільёнаў рабочых і сялян па практычным ажыцьцяўленьні сацыялізму» [2]). Такіму бальшавікоў Ленін называў «адзінай інтэрнацыянальскай тактыкай» ён сьцьвярджаў, што «бальшавізм гадзіцца як узор тактыкі для ўсіх» [3]).

Ленінізм узьнікае, разьвіваецца і мацнее на базе тэорыі Маркса і Энгельса, але адначасова з гэтым, адстойваючы на працягу ўсёй гісторыі рабочага руху апошніх дзесяцігодзьдзяў рэвалюцыйны марксізм, Ленін і ленінская партыя правялі «самастойную распрацоўку» тэорыі рэвалюцыйнага марксізму. Гэта вялізарная рэвалюцыйная тэарытычная работа праводзілася на аснове вывучэньня ня толькі вопыту трох рэвалюцый ў нашай краіне, але таксама і на аснове скарыстаньня і навуковай распрацоўкі вопыту клясавай барацьбы ў краінах сусьветнага імпэрыялізму і ў імпэрыялістычных калёніях і ў паўкалёніях. У нас у партыі і ва ўсіх партыях Камінтэрну атрымала ўсеагульнае прызнаньне і моцна замацавалася сталінскае вызначэньне ленінізму, як марксызму эпохі імпэрыялізму і пралетарскай рэвалюцыі. Ленінізм узьнік і афармёўся ў выніку самай жорсткай барацьбы ўнутры рабочага руху на два фронты. Гэту барацьбу на працягу ўсіх год свайго існаваньня бальшавізм вёў ня толькі ў рабочым руху нашай краіны, але і на міжнародным арэне, выступаючы ў якасьці самага перадавога і рэвалюцыйнага камуністычнага авангарду, вялікага вызваленчага руху рабочае клясы. І тут галоўнае асноўнае заключалася ня ў тым, што сказаў ці напісаў Ленін у той ці іншы момант гісторыі Другога інтэрнацыяналу, а ў тым зусім нясумненным і зусім бясспрэчным факце, што тактыка бальшавікоў была, «адзіна інтэрнацыяналістычная тактыкай», што бальшавізм і на міжнародным арэне з самага моманту свайго ўзьнікненьня выступаў і дзейнічаў як адзіная, да канца пасьлядоўная рэвалюцыйная сіла, ні на адну хвіліну ня выходзіўшая з пазіцыі рэвалюцыйнага марксызму ўсёй сваёй праграмай, тактыкай і арганізацыйнымі прынцыпамі супроцьстаячая лініі II інтэрнацыяналу. Гэта і знаходзіла свой адбітак у да канца пасьлядоўнай барацьбе бальшавізму ня толькі з апартунізмам і цэнтрызмам у II-м інтэрнацыянале, але таксама з хістаньнямі левых элемэнтаў у II-м інтэрнацыянале, ня раз скажаўшых яго вялікія ідэйныя і тактычныя асновы. Але «чаму іменна Расія,—так ставіў пытаньне тав. Сталін,—паслужыла прытулкам ленінізму, бацькаўшчынай тэорыі і практыкі пралетарскай рэвалюцыі?» [4]). Тав. Сталін адказваў на гэтае пытаньне так: «Таму, што Расія была цяжарна рэвалюцыяй больш, чымся якая небудзь іншая краіна, і толькі яна была ў стане а прычыны гэтага вырашыць гэтыя супярэчнасьці рэвалюцыйным шляхам». Прычым Расія была цяжарна такой рэвалюцыяй супроць царызму, якая «павінна была перарасьці ў рэвалюцыю супроць імпэрыялізму, у рэвалюцыю пралетарскую» [5]). Калі ўзяць гісторыю нашай партыі, увесь яе вялікі гістарычны шлях, дык яго трэба разглядаць, як адзіны працэс разьвіцьця адзінай партыі, прайшоўшы на чале рабочае клясы праз 3 рэвалюцыі і пра рабіўшы вялізарны рэвалюцыйны шлях ад панаваньня прыгоньнікаў памешчыкаў да ўстанаўленьня дыктатуры пралетарыяту і завяршэньня пабудовы эканамічнай базы сацыялізму. Трэба асабліва падкрэсьліць што на працягу ўсіх трох рэвалюцый ленінская партыя ў сваёй стратэгіі і тактыцы базавалася на адной і той-жа генэральнай ўстаноўцы. І трэба даць самы рашучы і бязьлітасны адпор самым нязначным спробам разарваць адзіную 30 гадовую гісторыю нашай партыі і расчленіць адзіны цэласны працэс выпрацоўкі Леніным пралетарскай тэорыі на аснове рэвалюцыйнага марксызму, на працягу ўсіх трох рэвалюцый, меўшых месца ў нашай краіне ў першыя два дзесяцігодзьдзі XX века.

Аднэй з важнейшых асаблівасьцяй бальшавізму зьяўляецца тое, што ён узьнік і афармёўся ў працэсе несупынай барацьбы з апартуністамі ўсіх масьцей і рознавіднасьцяй. Ленін пісаў аб тым, што «рабочая кляса не магла скласьці сваёй партыі інакш як у рашучай трыццацігадовай барацьбе з усімі рознавіднасьцямі апартунізму» [6]). Тав. Сталін, разьвіваючы гэта палажэньне, зазначаў, што «УсеКП(б) рабіла і мацнела праз перамаганьне ўнутрыпартыйных супярэчнасьцяй», і гэта, дадае ён, зьяўляецца «законам разьвіцьця нашай партыі». і ня толькі нашай партыі «гэты закон,—пісаў Сталін,—зьяўляецца законам разьвіцьця для ўсіх колькі небудзь вялікіх партый, усё роўна, ці ідзе гутарка аб пралетарскай партыі СССР, або аб партыях на Захадзе» [7]). У гэтым зноў вызначаецца міжнародны характар бальшавізму. У сакавіку 1917 году Леніну сваіх лістох з надзвычайнай рэзкасьцю пісаў аб «партыі новага тыпу», ні ў якім разе не «II Інтэрнацыянал» [8]).

Бальшавізм быў і ёсьць партыя гэтага «новага тыпу». Гэта партыя склалася ў барацьбе на два фронты. Гэта барацьба вялася бальшавікамі з самага моманту ўзьнікненьня бальшавізму, яна вялася і ўнутры нашай партыі і ў II-м Інтэрнацыянале, г. зн. і на ўнутранай расійскай і на міжнароднай арэне. На працягу ўсёй гісторыі нашай партыі Ленін адстойваў і на практыцы ажыцьцяўляў стварэньне партыі «новага тыпу» г. зн. рэвалюцыйнай пралетарскай партыі без апартуністаў і цэнтрыстаў. На гэтым-жа пункце гледжаньня ён стаяў у адносінах да II-га Інтэрнацыяналу.

Пры вывучэньні гісторыі партыі трэба выходзіць з таго, каб у гісторыі нашай партыі, выкладаньне асноўных фактаў, ідэй і заканамернасьцяй гісторыі бальшавізму, уносіць элемэнты партыйнай сучаснасьці. Трэба выходзіць з таго, што камуніст — партыйны гісторык ня можа быць рэгістратарам фактаў партыйнай гісторыі, ён абавязаны змагацца за ленінізм, супроць усіх і ўсялякіх скажэньняў тэорыі марксызму - ленінізму. І мы павінны патрабаваць ад тых людзей, якія вядуць работу па вывучэньні гісторыі нашай партыі, каб гэта работа была заснавана на дакладным вывучэньні гістарычных фактаў і была прасякнута мэтадам Маркса — Леніна, гэта значыць была пабудавана на пасьлядоўным правядзеньні рэвалюцыйнай дылектыкі. Мы павінны бязьлітасна змагацца перш за ўсё з самай злоснай спробай фальсіфікацыі гісторыі бальшавізму, якавой зьяўляецца трацкісцкая фальсіфікацыя гісторыі бальшавізму. Пры вывучэньні гісторыі партыі мы павінны з асаблівай уважлівасьцю дамагацца пасьлядоўнага правядзеньня прынцыпаў ленінскай дылектыкі. Элемэнты падобнай фальсіфікацыі і яўнай трацкісцкай кантрабанды трапілі ў чатырохтомную «гісторыю УсеКП(б)» пад рэдакцыяй тав. Яраслаўскага.

Ленін гаварыў аб тым, што бальшавізм «стаў сусьветным бальшавізмам, даў ідэю, тэорыю, праграму, тактыку, якая адрозьніваецца канкрэтна, практычна ад сацыял - шавінізму і сацыял-пацыфізму» [9]). І калі ён паказваў, што бальшавізм ёсьць «узор тактыкі для ўсіх», дык побач з гэтым ён з усёй рэзкасьцю падкрэсьліваў, што Каўцкі і К.° аказаліся «рэакцыянэрамі, абарон цамі горшага апартунізму і сацыялздрадніцтва», і што тактыка Шэйдэмана ў і Каўцкіх — гэта тактыка нявартая для ўзораў для ўсіх краін» [10]).

У цяперашнюю эпоху асноўнай апорай імпэрыялізму зьяўляецца сацыялфашызм, які абапіраецца на падкупленую капіталістамі рабочую арыстакратыю. Ленін неаднаразова паказваў, што «гэты вораг застаецца галоўным у міжнародным маштабе» [11]).

Мы ведаем, што даваенны апартунізм у часе першай імпэрыялістычнай вайны ператварыўся ў сацыял-шавінізм, а за апошнія гады стаў левым крылом фашысцкай буржуазіі, г. зн. ператварыўся ў сацыял - фашызм. Та кі шлях контррэвалюцыйнага перараджэньня II Інтэрнацыяналу. Ленінізм адстойвае асновы сваёй тэорыі і тактыкі супроць II Інтэрнацыяналу, супроць контррэвалюцыйнага трацкізму і супроць апартунізтаў, трацкісцкіх кантрабандыстаў, скажэнцаў усіх масьцей.

Бальшавізм вядзе і будзе весьці барацьбу супроць паклёпніцкіх выдумак II Інтэрнацыяналу.

Дзеячы сацыял - фашысцкага II Інтэрнацыяналу спрабавалі і да гэтага часу спрабуюць давесьці, што ленінізм зьяўляецца толькі нацыянальна - расійскім зьявішчам, прадуктам эканамічнай адсталасьці і ўсходняй азіятчыны і тым самым яны спрабуюць дыскрэдытаваць і разьбіць бальшавізм як «сусьветны бальшавізм».

Бальшавізм вядзе і будзе весьці барацьбу супроць трацкізму, які зараз зьяўляецца, як сказаў аб гэтым тав. Сталін, «перадавым атрадам контррэвалюцыйнай буржуазіі, што вядзе барацьбу супроць камунізму, супроць савецкай улады, супроць будаўніцтва сацыялізму ў СССР» [12]).

Становішча сусьветнага капіталізму рэзка і бесспэрапынна пагаршаецца. Эканамічны крызіс падрывае самыя асновы яго існаваньня. Клясавыя супярэчнасьці ў краінах імпэрыялізму паміж імпэрыялізмам і калёніямі да краін насьці абвастраюцца. У гэтай абстаноўцы капіталізм шукае выхаду ў вайне. Ідэйны багаж фашысцкай і так званай «левай» сацыял - дэмакратыі ўжо недастатковы для адурманьваньня мас, якія шукаюць ратунку ад новай імпэрыялістычнай вайны і ад імпэрыялістычнага наёмнага нявольніцтва. Імпэрыялістычная буржуазія ня супроць падкінуць яго трацкісцкай ідэалёгіяй. Нішто ня выратуе імпэрыялізм ад яго няўхільнай пагібелі, але памяркоўны хапаецца і за саломінку. Ён хапаецца і за тэорыі контррэвалюцыйнага трацкізму, які ў нас, у Саюзе, разьбіты, выкрыты і заклеймёны. Трацкізм пастаўляе на стол імпэрыялізму тое, што ён па - паклёпніцку пускаў у ход супроць ленінскай партыі, калі ён яшчэ быў «фракцыяй камунізму». Трацкізм даў буржуазную тэорыю аб немагчымасьці пабудовы сацыялізму ў аднэй краіне. Сталін яшчэ ў 1926 годзе гаварыў аб трацкісцкай тэорыі «расьсячэньня ленінізму на дзьве часткі: на ленінізм даваенны, ленінізм «стары», «нягодны»... і ленінізм новы, пасьляваенны, кастрычніцкі...» і Сталін даваў, што «тэорыя расьсячэньня ленінізму на дзьве часткі ёсьць тэорыя разбурэньня ленінізму...»

Чаму гэтае пытаньне паўстала так востра ў сучасны момант? Таму, што сучасны гістарычны момант — вельмі напружаны і востры. Таму што трацкізм «даўно ўжо перастаў быць фракцыяй камунізму», стаў «перадавым атрадам контррэвалюцыйнай буржуазіі». Таму, што ўскрылася трацкістская кантрабанда, якую працягвае трацкізм у замаскаваным выглядзе і выкрыліся былыя лібэралы, якія пакрываюць гэтае працягваньне. Бальшавізм вядзе і будзе весьці барацьбу супроць апартуністаў і скажэнцаў усіх масьцей, якія сваімі апартуністычнымі тэорыямі і апартуністычнымі справамі ліюць ваду на млын клясавых ворагаў партыі пралетарыяту. У гэтай барацьбе мы яшчэ больш навострым нашу баявую зброю, якой зьяўляецца рэвалюцыйная тэорыя Леніна

*) Даклад друкуецца ў скарочаным выглядзе.

[1]) Ленін т. XXV, стар. 171-172.
[2]) Ленін, т. XXIII, стар. 385-6.
[3]) Ленін, там-жа, стар. 386.
[4]) Сталін: «Пытаньні ленінізму», 8-е выданьне, стар. 78.
[5]) Там-жа стар. 78-9.
[6]) Ленін. т. XVIII, стар. 223.
[7]) Сталін, стэнаграфічная справаздача VII пашыранага пленуму Выканкому Камінтэрну, п. 2, стар. 2-3.
[8]) Ленінскі зборнік, II, стар. 292.
[9]) Ленін, т. XXIII, стар. 385.
[10]) Ленін, том XXIII, стар. 172 і 386.
[11]) Ленін, т. XXV, стар. 179. Курсыў мой, А. Б.
[12]) «Бальшавік» № 19—20, 1931 г., стар. 17. Сталін. Ліст у рэдакцыю «Пролетарской революции».

II. Крызіс сусьветнага капіталізму і вучэньне Леніна аб імпэрыялізьме

Я ўжо гаварыў аб тым, што тэорыя Леніна, яго вялікае вучэньне зьяўляецца магутным фактарам навуковага прадбачаньня і рэвалюцыйнага кіраўніцтва. Гэта абставіна на кожным кроку знаходзіць пацьвярджэньне пры разглядзе важнейшых фактаў і праблем сучаснага прыкладу. У прадмове да сваёй кнігі «Імпэрыялізм» Ленін зазначыў, што ў ацэнцы сучаснай палітыкі нічога нельга зразумець, калі не раз бацца належным чынам «у пытаньні аб эканамічнай сутнасьці імпэрыялізму». Наглядаючы асаблівасьці сусьветнага эканамічнага крызісу, бяручага свой пачатак з паловы 1929 году, лішні раз пераконваемся ў вялікім значэньні ленінскага вучэньня аб імпэрыялізьме для разуменьня важнейшых бакоў сучаснай сусьветнай палітыкі. Ход крызісу бліскуча пацьвярджае ленінскую тэорыю і бязьлітасна разьбівае ўсе прагнозы буржуазнай навукі і ўсе тэорыі і тэорыйкі ідэалёгаў сацыялфашыцоцкага II Інтэрнацыяналу. Сусьветны крызіс апошніх год паказаў, што карцелі, трэсты, разьвіцьцё манаполій, эрошчваньне банкаў з прамысловасьцю, г. зн. ператварэньня старога капіталізму ў капіталізм манапалістычны, ці імпэрыялізм, ня толькі ня зьнішчае крызысы, а, наадварот, гіганцкі іх пашырае, паглыбляе і абвастрае. Сучасны сусьветны крызіс дае для гэтага незьлічонную колькасьць довадаў. Мае месца гіганцкае зьніжэньне вытворчасьці ва ўсіх капіталістычных краінах. У наяўнасьці прамысловы крызіс, аграрны крызіс, а ў апошні час выбухнуў крэдытны крызіс, набыўшы характар усеагульнага фінансавага крызісу, г. зн. ахапіўшы грашовы зварот, крэдытную сыстэму, бюджэт і гэтак далей. У радзе краін (Англія, Швэцыя, Канада, Японія, Аргентына, Індыя і інш.) мае месца вострае абясцэньваньне валюты. Мае месца вострае скарачэньне разьмераў сусьветнага замежнага гандлю. Мае месца рост пратэкцыянізму ў самых крайніх яго формах. Аптовыя цэны на прамысловыя прадукты рэзка знізіліся. Цэны на с.-г. тавары знізіліся на 50 проц. і ніжэй. Простае раскраданьне і зьнішчэньне матар'яльных каштоўнасьцяй за апошнія крызісныя гады дасягае ня чуваных разьмераў і набывае нябачаныя па сваім цынізьме, нават пры капіталізьме, формы.

Усе гэтыя факты даводзяць найвялікшую вастрату і нябачаную глыбіню сучаснага крызісу. Гэта адбываецца таму, што сусьветны эканамічны крызіс разгортваецца на аснове агульнага крызісу капіталізму. Ленін у сваёй характарыстыцы імпэрыялізму казаў аб тым, што ў наяўнасьці ёсьць «імкненьне да застою і загніваньня», г. зн. растрата прадукцыйных сіл, затрымка і нават прыпыненьне тэхнічнага прагрэсу, паразітызм і інш. Ленін дае вызначэньне імпэрыялізму ў такой фармулёўцы: «Імпэрыялізм ёсьць асобая гістарычная стадыя капіталізму. Асаблівасьць гэта траякая: імпэрыялізм ёсьць (1) манапалістычны капіталізм; (2)—паразітычны або загніваючы капіталізм; (3) уміраючы капіталізм» [13]). Без зразуменьня гэтай ленінскай устаноўкі нельга зразумець ні характару сучаснай эпохі ў разьвіцьці капіталізму, ні асаблівасьцяй разьвіцьця сусьветнага эканамічнага крызісу апошніх год. Выключнае значэньне для зразуменьня ўсяго механізму сучаснага капіталістычнага крызісу мае заўвага Леніна аб тым, што імпэрыялізм «ня можа перабудаваць капіталізму зьнізу да верху», ня можа зьнішчыць «абмену рынка, канкурэнцыі, крызісаў і г. д.». Гэта частка вучэньня Леніна аб імпэрыялізьме мае вялізарнае значэньне для марксызму і сучаснага рабочага руху. Ленін характарызаваў імпэрыялізм як уміраючы капіталізм, але ў той жа час ён асабліва падкрэсьліваў, што «імпэрыялізм ёсьць аджываючы, але не аджыўшы капіталізм, уміраючы, але не памёршы». У той - жа час Ленін зазначыў, што «манаполія, выраслая ючы з вольнай канкурэнцыі, ня зьнішчае яе, а існуе над ёй і радам з ёю, параджаючы гэтым рад асабліва вострых і буйных супярэчнасьцяй, непара зуменьняў, канфліктаў» [14]). У другім месцы, разьвіваючы гэту-ж думку, Ленін пісаў, што «іменна гэта злучэньне супярэчнасьцяй адзін аднаму «пачаткаў»: канкурэнцыі і манаполіі — і істотна для імпэрыялізму, іменна ён і падрых тоўвае крах; г. зн. сацыялістычную рэвалюцыю» [17]). Адсюль выцякае і сьцьвярджэньне Леніна, што «імпэрыялізм ёсьць пярэдадзень сацыяльнай рэвалюцыі пралетарыяту». Калі ўзяць факты з гісторыі сусьветнага крызісу апошніх год, дык навочна ўбачым усе асаблівасьці мэханізму сучаснага крызісу, адбіваючага асаблівасьці тэй эпохі, у якой ён разгортваецца. Мы маем нераўнамернасьць у зьніжэньні розных галін вытворчасьці (выраб сродкаў вытворчасьці і выраб сродкаў спажываньня). Мы маем нераўнамернасьць зьніжэньня цэн, якое выражаецца ў тым, што манапольныя цэны зьніжаюцца значна менш, чым не манапольныя. Мы маем яўную затрымку ў надыходзе крэдытнага крызісу, які надышоў не адразу, а праз 2 гады пасьля пачатку прамысловага крызісу. Мы маем у капіталістычных краінах зьнішчэньне таварных запасаў, нябачаную вакханалію пратэкцыянізму, дзівоснае беспрацоўе, гіганцкае зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню рабочых мас і сярэдніх пражэньных пластоў насельніцтва. Усё гэта такія рысы сучаснага крызісу, якія адбіваюць манапалістычны харак тар сучаснага капіталізму.

Сусьветны крызіс апошніх год справаджаецца гіганцкім ростам супярэчнасьцяй унутры імпэрыялістычнага лягера, вельмі вялікім абвастрэньнем узаемаадносін паміж імпэрыялізмам і калёніямі, растуць і паглыбляюцца ўсе супярэчнасьці капіталістычнага ладу, абвастраюцца ўзаемаадносіны цаміж краінамі капіталізму і адзінай у сьвеце пралетарскай дзяржавай. Нарастаюць і ўзмацняюцца пагрозы вайны і перш за ўсё пагроза нападу на Саюз сацыялістычных савецкіх рэспублік. Ход і разьвіцьцё крызісу шчыльна падводзіць нас да сьцьвярджэньня Леніна аб тым, што імпэрыялізм ёсьць пярэдадзень сацыялістычнай рэвалюцыі.

Сусьветны капіталістычны крызіс яшчэ раз з надзвычайнай навочнасьцю выкрыў усю глыбіню і значэньне закону нераўнамернасьцяй эканамічнага і палітычнага разьвіцьця капіталістычных краін. Гэты закон мае выключнае значэньне для камунізму, бо з яго выцякае магчымасьць перамогі сацыялізму ў асобных капіталістычных краінах. Гэты закон быў адкрыты Леніным. Сталін разьвіў і адстаяў яго ў лютай барацьбе з трацкісцка - зіноўеўскай апазіцыяй, якая спрабавала падкапіцімі антыпартыйнымі выказкамі вырваць з рук камунізму гэту адну з важнейшых тэарытычных зброй пралетарскай рэвалюцыі.

«Нераўнамернасьць эканамічнага і палітычнага разьвіцьця, — пісаў Ленін, —ёсьць бязумоўны закон капіталізму. Адсюль вынікае, што магчыма перамога сацыялізму першапачаткова ў нямногіх ці нават у адной, асобна ўзятай, капіталістычнай краіне» [19]). Ленін падкрэсьліваў, што «фінансавыя капіталы і трэсты не паспабляюць а ўзмацняюць нераўнамернасьць паміж хуткасьцю росту розных частак сусьветнай гаспадаркі. А калі суадносіны сіл зьмяніліся,—дадае ён,—дык у чым можа заключацца, пры капіталізьме, разьвязаньне супярэчнасьці, апрача як у сіле» [20]). Тав. Сталін, баронячы і разьвіваючы гэты закон аб нераўнамернасьці разьвіцьця, выкрываючы антыленінскі пункт погляду трацкістаў (у 1926—1927 гг.) у гэтым пытаньні, зазначаў, што нельга зьмешваць «эканамічную няроўнасьць паасобных краін у мінулым» з «нераўнамернасьцю эканамічнага і палітычнага разьвіцьця ў перыяд імпэрыялізму». Пры гэтым ён зноў пад крэсьліваў, што гэта нераўнамернасьць разьвіцьця праяўляецца «вастрэй, чым раней», і што яна «вядзе да таго, што здаўшыя ў прамысловых адносінах краіны ў больш або менш кароткі тэрмін пераганяюць пашоўшыя наперад краіны, што ня можа не стварыць, такім чынам, прадпасылак для вялізарных імпэрыялістычных войн аў і магчымасьці перамогі сацыялізму ў аднэй краіне» [21]).

Факты сучаснага крызісу даюць шматлікае пацьвярджэньне гэтага закону. Як разгортваўся эканамічны крызіс апошніх год у самым пачатку? У канцы 1928 г.—аграрны крызіс у Канадзе, Амэрыцы, Аргентыне, Бразыліі і Аўстраліі. На працягу 1929 г. прамысловы крызіс спачатку разгортваецца ў Румыніі, Польшчы і на Балканах, а затым, у другой палове гэта га году, у ПАЗШ. Пасьля гэтага ён пераходзіць у Канаду і Японію, затым ударае Кітай і рад іншых калёніяльных краін. У краінах Заходняй Эўропы крызіс пачынае разгортвацца толькі з пачатку 1930 г. У палове 1931 г. надыходзіць крэдытны крызіс, які пераходзіць ва ўсеагульны фінансавы крызіс. Пры чым наступленьне крэдытнага крызісу праз 2 гады пасьля прамысловага вядзе да пагрыбленьня сусьветнага эканамічнага крызісу.

У выніку абвостранай барацьбы паміж буйнейшымі капіталістычнымі краінамі ў часе крызісу мае месца рэзкая і скачкападобная зьмена расстаноўкі сіл у лягеры імпэрыялізму. Аб гэтым навочна сьведчаць зьмены, меўшыя месца ў капіталістычнай Эўропе за мінулы 1931 г.

З эпохай імпэрыялізму Ленін цясьнейшым чынам зьвязваў пытаньне аб ператварэньні апартунізму ў сацыялшавінізм. Гісторыя фашысцкай сацыял дэмакратыі бліскуча пацьвярджае гэтую частку ленінскага вучэньня аб імпэрыялізьме.

У часе вайны Ленін пісаў, што апартунізм «канчаткова пасьпеў, перасьпеў і згніў у радзе краін, упаўне зьліўшыся з буржуазнай палітыкай, як сацыял-шавінізм» [22]).

Апошні перыяд у гісторыі фашысцкай сацыял - дэмакратыі, зьвязаны з сусьветным капіталістычным крызісам, дае малюнак, таго, як II Інтэрнацыянал робіць цэлы рад новых крокаў па шляху сваёй далейшай фашызацыі. II Інтэрнацыянал за апошнія гады перайшоў на шлях цкоднітва і інтэрвэнцыі. Працэс меншавікоў гэтай сэкцыі II Інтэрнацыяналу давёў гэта з неабвяргальнай яснасьцю.

Гэта новая тактыка II Інтэрнацыяналу знаходзіць свае тэарытычнае абгрунтаваньне ў «працах» сацыял-інтэрвэнта Карла Каўцкага. Яго брашура «Бальшавізм у тупіку» паказвае сабой крайнюю ступень ганебнейшага контрэвалюцыйнага падзеньня II Інтэрнацыяналу. У сваёй двухтомнай працы «Матэрыялістычнае разуменьне гісторыі» Карл Каўцкі выступае да апошняй ступені цынічным і адкрытым апалёгетам капіталізму.

Перыяд сусьветнага капіталістычнага крызісу зьвяўляецца перыядам далейшай ўзмоцненай фашызацыі II Інтэрнацыяналу.

Сусьветны капіталістычны крызіс апошніх год зьяўляецца, як адзначаў гэта тав. Сталін у сваім дакладзе на XVI партыйным зьезьдзе, «самым сур'ёзным і самым глыбокім з усіх існуючых да гэтага часу сусьветных эканамічных крызісаў». І гэта адбываецца ня толькі таму, што сучасны сусьветны крызіс разгортваецца ва ўмовах узмацняючагася загніваньня капіталізму і на базе яго агульнага крызісу, але таксама і таму, што «поруч з капіталістычнай сыстэмай гаспадаркі існуе сацыялістычная сыстэма, якая расьце, якая разьвіваецца, якая процістаіць капіталістычнай сыстэме, і якая самым фактам свайго існаваньня дэманструе гніласьць капіталізму, расхістае яго асновы» [23]). У моц гэтага надзвычайна абвастрацца і паглыбляецца агульны крызіс капіталізму.

З вучэньня Леніна аб імпэрыялізьме выцякае яго разуменьне пралетарскай рэвалюцыі. Гэта тэорыя рэзка накіравана і супроць люксэмбургізьмцтва, якое, выходзячы з разуменьня імпэрыялізму, як «чыстага», «цэльнага» імпэрыялізму, адмаўляла значэньне сялянства і нацыянальнага вызваленчага руху ў эпоху імпэрыялізму, выкрывала опаўзаньне да сацыял-дэмакратычнага пункту погляду ў пытаньні аб дыктатуры пралетарыяту і г. д.

У сучасны момант існуе сацыял-фашысцкая тэорыя «дзяржаўнага капіталізму», якая ёсьць нішто іншае, як пад яўленая і падфарбаваная тэорыя «ультра - імпэрыялізму» і «арганізаванага капіталізму». Яна падхапляецца праваапартуністычнымі элемэнтамі. Існуюць таксама і тэорыі, прыкрываючыя свае апартуністычнае і нават сацыял - фашысткае паходжаньне «левымі» фразамі. Гэтыя тэорыі выходзяць з разуменьня імпэрыялізму ў сучаснай яго стадыі, як «чыстага манапалізму», і базуюцца на цьвярджэньні аб «поўным прыпыненьні разьвіцьця прадукцыйных сіл» пры імпэрыялізьме, аб тым, што «пры імпэрыялізьме страча на здольнасьць грамады да разьвіцьця». Гэтыя «левыя» тэорыі зьяўляюцца ні чым іншым як перапевамі люксэмбургізьмцкіх поглядаў на імпэрыялізм з яго пропаведзьдзю аўтаматычнага краху капіталізму.

На аснове ленінскага вучэньня аб імпэрыялізьме і пралетарскай рэвалюцыі мы павінны даць бязьлітасны адпор усім гэтым сацыял-фашысцкім і апартуністычным тэорыям, якія дэзарганізуюць клясавую барацьбу пралетарыяту супроць імпэрыялізму. У сучасны момант ідзе і разгортваецца лютая барацьба двух выхадаў з сусьветнага капіталістычнага крызісу — рэвалюцыйнага і капіталістычнага. Пралетары ўсіх капіталістычных краін ахопленых крызісам, з гіганцкай упартасьцю вядуць барацьбу за рэвалюцыйны выхад. Ленінізм зьяўляецца кіраўніцтвам у дзеяньні. Пад гэтым сьцягам пралетары ўсяго сьвету нізьвяргаюць і нізьвергнуць імпэрыялізм.

[13]) Ленін, т. XIX. стар. 301.
[14]) Ленін, т. XIX, стар. 142
[17]) Ленін, т. XX, стар. 297.
[24]) Ленін, т. XVI, 1-е выд.; стар. 251.
[19]) Ленін, т. XVIII, стар. 233.
[20]) Ленін, т. XIX, стар. 149.
[21]) Сталін, там-жа, стар. 515.
[26]) Сталін, «Вопросы ленинизма», стар. 464.
[22]) Ленін, т. XIX, стар. 159.
[23]) Сталін «Вопросы Ленинизма», стар. 581.

III. Аб некаторых пэрспэктывах у сувязі з пабудоваю эканамічнай базы сацыялізму

Апошнія тры гады для Саюзных сацыялістых савецкіх рэспублік былі гадамі сацыялістычнага ўздыму і вялізарных сацыяльна - эканамічных зрухаў, зьвязаных з разгорнутым сацыялістычным наступам. Асноўны вынік, з якім мы заканчваем першую пяцігодку,—гэта завяршэньне пабудовы сацыялістычнага фундаманту народнай гаспадаркі. Адначасова гэта зьяўляецца рэзультатам правадзімай намі за апошнае дзесяцігодзьдзе палітыкі нэпу.

І вось у сучасны момант, у пачатку апошняга году першай пяцігодкі, мы можам падвесьці вынікі дзесяцігодзьдзя нэпу, можам падвесьці гэтыя вынікі з вялізарным плюсам, а мензвіта—за гэтыя гады мы дабіліся таго, што моцна заклалі эканамічную базу сацыялізму.

Гэты вынік, адзначаючы сабой вялізарную перамогу сацыялізму, ня можа не зьявіцца выходным пунктам для пастаноўкі цэлага раду новых задач сацыялістычнага будаўніцтва. Я ня буду прыводзіць лічбы, характарызуючыя вынік нашых сацыялістычных перамог,—яны ўсім вядомы. Яны сьведчаць аб тым, што сацыялістычны сэктар ва ўсёй нашай народнай гаспадарцы заняў дамінуючае становішча і пытаньне «хто каго» вырашана ў СССР цьвёрда.

Ленін казаў у 1918 г.: «Каб перамагчы, каб стварыць і ўмацаваць сацыялізм, пралетарыят павінен... павесьці за сабой ўсю масу працоўных і эксплёатуемых, а таксама ўсе дробнабуржуазныя сілы на шлях... стварэньня новай арганізацыі працы, злучаючай апошняе слова навукі і капіталістычнай тэхнікі з масавым аб'яднаньнем сьвядомых рабочых, творчых буйную сацыялістычную вытворчасьць» [24]).

Вось як ставіў пытаньне аб тэхніцы і буйнай вытворчасьці Ленін. Ідучы па шляху пабудовы эканамічнай базы сацыялізму, нам трэба было разьвіць буйную сацыялістычную індустрыю. Тав. Сталін высунуў у свой час вялізарнае значэньне сельскагаспадарчай базы для разьвіцьця цяжкай індустрыі ў рэканструкцыйны пэрыяд.

Я напомню вам, што ў 1928 г. тав. Сталін у сваёй гутарцы са студэнтамі Інстытуту чырвонай прафэсуры, Камакадэміі і Сьвярдлоўскага інстытуту, аналізуючы прычыны затрудненьняў на збожжавым фронце, якія былі ў той час, зазначаў, што пасьля Кастрычніка дробная оялянская гаспадарка стала цэнтральнай фігурай земляробства, пры чым яна дае і «найменшую колькасьць таварнага збожжа», а разьвіцьцё сацыялістычнай індустрыі вымагае вялізнага пашырэньня сельскагаспадарчай сыравінай базы,—адсюль і збожжавыя затрудненьні.

Дзе выхад?—ставіў пытаньне тав. Сталін.

Выхад паказваў ён «ў пераходзе ад індывідуальнай оялянскай гаспадаркі да калектыўнай, да грамадзкай гаспадаркі ў земляробстве».

Гэтым самым і ў галіне сельскай гаспадаркі на новую глебу было пастаўлена пытаньне аб тэхніцы. Адсюль і ставілася задача: «забясьпечыць сельскую гаспадарку максымальна прылада мі і сродкамі, неабходнымі для таго, каб пасьпорыць і рушыць наперад справу яе рэканструкцыі на новай тэхнічнай базе» [25]).

У сучасны момант, у сувязі з тымі вялікімі пэрспэктывамі, якія высоўваюцца перад намі, менавіта таму, што мы заклалі эканамічную базу сацыялізму, пытаньне аб тэхніцы і тэхнічнай рэканструкцыі, пабудаванай на даных навейшай навукі, высоўваюцца як ніколі. «Тэхніка,—гаворачы словамі тав. Сталіна, — у рэканструкцыйны пэрыяд вырашае ўсё». Задача аўладаньня тэхнікай і навукай зьяўляецца важнейшай задачай з пункту погляду паскораньня тэмпаў будаўніцтва сацыялістычнай індустрыі і сацыялістычнай пераробкі сялянскай гаспадаркі, якая ў гэтым годзе дасягнула вялізарных вынікаў, дабіўшыся 62 проц. калектывізацыі, на аснове якой мы праводзілі ліквідацыю кулацтва як клясы.

У сувязі з завяршэньнем пабудовы эканамічнай базы сацыялізму высоўваецца цэлы рад новых задач у галіне народнай гаспадаркі, ажыцьцяўленьне якіх магчыма толькі на аснове тэхнічнай рэканструкцыі прамысловасьці, транспарту і сельскай гаспадаркі. Такім чынам, асноўны вынік першай пяцігодкі — паставіць перад намі задачу тэхнічнай рэканструкцыі на новую, вышэйшую ступень.

Вялізарнае значэньне ў гэтай абстаноўцы мае барацьба за практычнае правядзеньне шасьці гістарычных указаньняў тав. Сталіна.

У сувязі з гэтым мы павінны паставіць і пытаньне аб прадукцыйнасьці працы, бо гэта пытаньне зьяўляецца рашаючым у справе перамогі сацыялізму Ленін казаў: і «Прадукцыйнасьць працы — гэта ўрэшце самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу».

Завяршэньне пабудовы эканамічнай базы сацыялізму адкрывае перад намі вялізарную пэрспэктыву пасьпяховай барацьбы за новую тэхніку, за новую арганізацыю працы, за падвышэньне прадукцыйнасьці працы. Гэта адкрывае вялікія пэрспэктывы ў справе завяршэньня і ўмацаньня калектывізацыі, канчатковай ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў, гі

СПРАВАЗДАЧА ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАНТРОЛЬНАЙ КАМІССІ*)

Даклад старшыні ЦКК КП(б)Б тав. Калніна на XIV зьезьдзе КП(б)Б

Таварышы! За пэрыяд паміж XIII і XIV зьездамі КП(б)Б наша партыя дабілася вялізарных посьпехаў у росьце сацыялістычнай індустрыі і павароце бяднацка-серадняцкіх мас на шлях калектывізацыі. Калгаснае сялянства ператварылася ў цэнтральную фігуру земляробства і асноўную апору партыі і савецкай улады на вёсцы. Побач з ростам індустрыі і посьпехамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі вырас і ўзьнялося культурны ўзровень працоўных мас і палепшылася матар'яльна-бытавое становішча рабочай клясы.

Гэтых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве КП(б)Б дабілася дзякуючы правільнаму праведзеньню генэральнай лініі партыі, у барацьбе з правым апартунізмам і «левым» загібамі і прымірэнчымі адносінамі да іх, мабілізуючы партарганізацыю і рабочыя масы на непрымірымую барацьбу супроць спроб апартуністаў зьвесьці партыю з правільнага шляху.

I. Барацьба за адзінства партыйных радоў

Асноўны з вузлавых вучасткаў нашай работы—гэта **барацьба за ленінскае адзінства нашай партыі, за праведзеньне генэральнай лініі нашай партыі**, перш за ўсё барацьба з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» за тібамі і прымірэнчымі адносінамі да ўхілаў ад бальшавізму. Апартуністы ўсіх масьцей зараз не адважваюцца выступаць адкрыта супроць генэральнай лініі партыі. На словах яны галасуюць за лінію партыі, а на справе зрываюць яе ажыцьцяўленьне.

Я хацеў-бы спыніцца на новых розных адзнаках праваго апартунізму, якія ў асобных зьвеньнях нашай арганізацыі знайшлі паўнае пашырэньне. Увосень гэтага году мы правялі ў сувязі са збожжазагатоўкамі праверку збожжафуражнага балянсу ў 130 саўгасах. На чале гэтых саўгасаў усюды стаялі камуністы. Аднак, у радзе саўгасаў моцна былі пашыраны буржуазна-рвацкія тэндэнцыі. Яны праявіліся ў перарасходаваньні збожжа, утойваньні натэўных запасаў збожжа, у паказаньнях, што ў іх жывёлы больш, чым на самай справе. Такім чынам асобныя кіраўнікі саўгасаў імкнуліся схаваць ад дзяржавы тыя сапраўдныя збожжавыя запасы, якія ёсьць. У якасьці прыкладу прыведу толькі адзін саўгас Сьвінаводтрэсту «Каменку». Ёсьць там 117 чала век, а ў збожжафуражным балянсе паказана 304, што адразу павялічыла патрэбу колькасьці збожжа. Замест 94 кароў ён паказаў 138. Кармовы балянс павялічыў на 1.876 цнт., насенныя фонды—на 131 проц.

У рэзультаце такога складаньня збожжафуражнага балянсу атрымалася, што саўгас ня толькі ня можа даць збожжа дзяржаве, а дзяржава павінна даць яму. Гэта не адзіночны прыклад. Такіх прыкладаў можна падаць многа. Буржуазна-рвацкія тэндэнцыі маюць даволі значнае пашырэньне сярод асобных кіраўнікоў, у некаторых саўгасах і калгасах. Носьбіты буржуазных тэндэнцый, сказіцелі гаспадарчага разрахунку, лічаць, што, паколькі прадпрыемства знаходзіцца на гаспадарчым разрахунку, то яно можа не падпарадкавацца дзяржаўнаму пляну і разбазарваць рэсурсы на свой погляд.

Аналёгічныя прыклады можна прывесьці па лініі Белсельгасаб'яднаньня Белкаапсаюзу. Пры вызначэньні пасеўных плошчаў прыгарадных гаспадарак яны першапачаткова ўстанавілі, што можна сабраць ураджаю з гарадаў у 41.700 тон гародніны, а калі трэба было зьбіраць гэты ўраджай, дырэкцыя аб'яднаньня зьнізіла цыфру да 21.000 тон, а іншыя—21.000 тон пакідаюцца «на ўсякі выпадак». На маё запытаньне—дзе-ж другая палова ўраджаю з гэтых прыгарадных гаспадарак, мы яшчэ не дабіліся адказу ад кіраўнікоў гэтага самога аб'яднаньня. Ім няма чаго адказаць.

У гэтым-жа аб'яднаньні дапусьцілі такую справу. У нас па Беларусі, прыкладам, у сярэднім ураджай буль бы з аднаго гэктара 9 тон. Гэтае-ж самае аб'яднаньне падлічыла, што ў іх столькі ніяк ня выйдзе, што ў іх вельмі дрэнны ўраджай і дасьць ён толькі 6 тон з гэктара. Мы гэта кваліфікавалі, як праўленьне буржуазных тэндэнцый.

Гэтыя буржуазна-рвацкія тэндэнцыі атрымалі жорсткі адпор з боку ЦК партыі і ЦКК.

Другі від праяўленьня буржуазна-рвацкіх тэндэнцый—гэта ў справе зосяроджаньня таварнай прадукцыі. Вязьму трэст Сьвінавод. Па Сьвінаводзе мы маем такое становішча, калі кожны саўгас для сваіх патрэб забіваў па 32 сьвіньні, а агулам усе саўгасы забілі 2 700 сьвіней па ўсёй Беларусі, а дзяржаве здалі (прадалі) толькі 15 000

А ў калгасах? Канкрэтныя факты гавораць аб тым, што і ў радзе калгасаў існуюць буржуазна-рвацкія тэндэнцыі. Падаўшы ў пацьвярджэньне гэтага рад фактаў асобных калгасаў, дрэннага выкананьня імі абавязкаў перад дзяржавай, тав. Калнін падкрэсьлівае—гэта сьведчыць аб тым, што ў нас на мясцох яшчэ ня ўсюды разгорнута рашучая барацьба супроць буржуазных тэндэнцый, буржуазна-рвацкіх тэндэнцый нашых калгасаў і саўгасаў, што нашы асобныя партыйныя арганізацыі слаба вялі барацьбу з гэтымі тэндэнцыямі, ня была праведзена належная растлумачальная работа сярод калгасных мас аб шкодлівасьці гэтых тэндэнцый.

Нашы партыйныя арганізацыі на мясцох ва многіх выпадках не ўважліва адносяцца да разгортваньня масавай работы, невыстарчальна ўцягваюць у работу беднату для таго, каб выкрыць усе тыя клясава-варожыя элементы, якія імкнуцца пралезьці ў калгасы з мэтай разбурыць іх з сярэдзіны.

Па 38 раёнах ня было выкрыта калія 263 кулакі, а па 52 раёнах да 10 лістапада было спагнана самаабкладаньня з кулацкіх гаспадарак толькі ў разьмеры 13,7 проц.

Аб чым гавораць гэтыя факты? Яны пацьвярджаюць тое, што мы кулакоў часта недаабкладаем у індывідуальным парадку.

Апартуністы для прыкрываньня сваёй апартуністычнай практыкі скарыстоўваюць такі агідны мэтад, як «очковтирательство».

І недарма я задаў пытаньне сакратару Гарадоцкага раёну, які тут выступіў,—чаму ён нічога аб гэтым не гаварыў. Ён правільна крытыкаваў недахопы цэнтральнага апарату, але яму трэба было сказаць і аб сваіх памылках.

Гарадоцкі раён па асеньняй сяўбе рапартуе ЦК, СНК і савецкай грамадзкасьці аб тым, што ў іх асеньняя сяўба скончана. А калі мясцовая кантрольная камісія пачынае правяраць, аказваецца, што сяўба яшчэ далёка ня скончана.

А якія разважаньні пайшлі вакол гэтага? «Бачыце, у нас сяўба ідзе ненармальна і пры ненармальным ходзе сяўбы ня можа быць нармальнага ўліку»... ці такія разважаньні: «пакуль дойдзе рапарт, мы гэты процант дагоним, і справа з сяўбой будзе закончана».

Куды варта такая пастаноўка пытаньня? Каго ашуквалі? Каму гэта трэба? **Нікому!**

У гэтым раёне ёсьць справы яшчэ горшыя. Я толькі што даведаўся, што ў гэтым раёне і па пытаньні ільнязаготавак быццам таксама ня ўсё ў парадку.

Уваравіцкі раён таксама займаўся «очковтирательством». Ён зьменшыў пасеўную плошчу на 6.320 гэкт. і для таго, каб даказаць, што сапраўды такой плошчы няма і ня можа быць, раённыя ўстановы назад пайшлі на такую вялікую работу, як абмер зямлі. А ў справе выкананьня пляну сяўбы мала што зрабілі. І варта было нам толькі проста паехаць у раён, як пераканаліся, што зямлі хопіць, што скарачаць плян—злачынства. Плян быў правільны. Факты «очковтирательства» не адзіночныя. Мы па гэтых справах моцна ўдарылі. У адносінах барацьбы з «очковтирательством» трэба будзе разгарнуць значна большую работу, дабіцца такога становішча, каб такіх нецярпімых выпадкаў больш ня было, бязьлітасна змагаючыся з імі, як з простым ашуканьнем партыі і ўраду.

Я гаварыў пра сельскую гаспадарку. Назіраюцца такія-ж факты і ў прамысловасьці. У Крычаве будуецца вялікі цэмантны завод, які павінен быў быць закончаны да Кастрычніцкіх сьвят. Заводзкі трыкутнік пастанавіў рапартаваць, што да Кастрычніцкай тадаваны ён закончыў будаўніцтва заводу. Гэта ў той час, калі плян быў выканан толькі на 30 проц.

А вось другі від «очковтирательства» на Заходняй чыгунцы. Дырэктар Наўмаў пасьля таго, як ЦК і СНК Саюзу апублікавалі адозву аб неабходным правядзеньні спаранай ямы, праз некаторы час напісаў дакладную запіску ў ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу аб тым, што Заходняю чыгункаю спаравая ямы праведзена на ўсе 100 проц. У той-жа час мы правялі праверку, і выявілася што спаравая ямы ў вялізарным процанце арыгінальна па 7 станцыях, па 7 вузлавых пунктах, і гаварыць пра 100 проц. праведзеньне спаранай ямы—гэта яўнае «очковтирательство». І тут павінна быць самая бязьлітасная барацьба.

Далей тав **Калнін**, выкрываючы факты «лявацкіх» перагібаў, якія мелі месца ў радзе раёнаў (Лельчыцы, Чырвоная Слабада, Камарын, Койданава і інш.), даў глыбокі аналіз гэтым фактам, завастрыў увагу на неабходнасьці **ўзмацненьня барацьбы супроць усякіх апартуністычных скажэньняў лініі партыі.**

Адначасова ЦКК вяла рашучую барацьбу з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага троцкізму, з троцкісцкай кантрабандай. Я назаву, толькі некаторых асоб: Каментаровіч, Пагосцкі, Эдвін—тыповыя троцкісты добра ўсьвядомілыя тактыку троцкістаў. Заяўляюць аб адыходзе ад троцкізму, а на справе кантрабандай працягваілі троцкізм. Адзін з іх—Эдвін—падтрымліваў непасрэдную сувязь з троцкістамі. Па гэтым выпадку мы рашучым чынам ударылі, лічачы, што гэтыя людзі больш непапраўныя, што яны нічога агульнага з нашай партыяй ня маюць і іх трэба проста выгнаць з партыі, як непатрэбны элемэнт, які толькі шкодзіць партыі.

Праяўленьне апартунізму—і права-га і «левага»—зьяўляецца адлюстраваньнем супраціўленьня аджываючых клясаў справе будаўніцтва сацыялізму. Ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы клясава-варожыя ўплывы прасякаюць у шасобныя праслойкі пралетарыяту і шасобныя каморкі нашай партыі. Гэтыя ўплывы зьяўляюцца крыніцай і базай правых і «левых» апартуністычных хіснаньняў і ўхілаў у нашай партыі ад яе генэральнай лініі.

Гэта, таварышы, гаворыць аб тым, што нам у далейшым неабходна знач на больш разгарнуць барацьбу з правым апартунізмам, які застаецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, барацьбу з «левым» апартунізмам, з троцкісцкай кантрабандай і гнілым лібэралізмам. Нам неабходна ўзмацніць марксыцка-ленінскае выхаваньне партыйных радоў, павысіць клясавую пільнасьць усіх партыйных арганізацый. Кантрольная камісія сваёй барацьбой з апартунізмамі ўсіх масьцей павінны **ўзмацніць яшчэ большую барацьбу за ідэйную згуртаванасьць партыі на ленінскай аснове, за выхаваньне ў кожным бальшавіку найвялікшай дысцыпліны і адказнасьці за справу партыі.** Неабходна дабіцца такога становішча, каб кантрольным камісіям зьверху ня прыходзілася ўскрываць апартуністычныя скажэньні лініі партыі, а каб кожная ячэйка, кожны член партыі давалі адпор усякім спробам тармазіць выкананьне баявых задач сацыялістычнага будаўніцтва, узьнялі гэтым самым авангардную вядучую ролю камуністаў на ўсіх вучастках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

II. За выразнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, супроць ухілаў у нацпытаньні

Некалькі слоў пра нацыянальнае пытаньне. Наступленьне на капіталістычныя элементы па ўсім фронце і абвостранае з гэтым абвастрэньне клясавай барацьбы—выклікаюць «актывізацыю ў радох партый нацыянальных ухілаў у бок вялікадзяржаўнага і мясцовага шавінізму» (з рэзалюцыі XVI зьезду УсеКП(б).

Перш за ўсё аб ухіле да вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпецы. У Чачэрскім раёне мы мелі такі выпадак, калі ў нацыянальным польскім сельсавеце работа праводзілася на беларускай і расійскай мовах, але не на польскай, калі школы з прычыны «адсутнасьці» настаўнікаў, перавялі на беларускую мову. У Віцебску быў такі-ж характэрны выпадак: студэнты вэтэрынарнага інстытуту адмовіліся вучыцца па падручніках на беларускай мове. У гэтым інстытуце доўгі час вісеў плякат, на якім было напісана, што расійскі селянін лепшы, чым беларускі. Партарганізацыя зусім гэтага ня ведала і заўважыла гэта толькі тады, як камісія ЦК і ЦКК правяла абсьледваньне Віцебскай арганізацыі. У гэтым-жа самым Віцебску прафэсар Малкін выступіў аб тым, што студэнтаў няма чаго пасылаць на практыку на беларускія прадпрыемствы, бо ўся беларуская прамысловасьць—саматужная прамысловасьць і там нічому не навучышся. Такіх прыкладаў я-б мог прывесьці ня мала.

У адносінах праяўленьняў беларускага шавінізму тав. Калнін ахарактарызаваў сутнасьць дзейнасьці беларускай шацдэмаўшчыны і бязьлітасную барацьбу КП(б)Б па разгроме гнідой контр-рэвалюцыйнай арганізацыі і рашучага выпканьня з радоў партыі нацыянал-апартуністаў.

Таксама дакладчык спыніўся на фактах барацьбы з антысэмітызмам, вэрэйскім і іншымі відамі шавінізму.

Дзейнасьць беларускага нацыянал-апартунізму павінна нам паслужыць урокам у тым сэнсе, каб наша партарганізацыя была больш пільнай. Пакуль ёсьць клясы, клясавая барацьба, наміўчуны і ўсякія праяўленьні шавінізму. Нам трэба выхоўваць і ўзьнімаць тэарытычны ўзровень партыйных мас на такую вышыню, каб яны маглі пазнаваць клясавага ворага ва ўсіх яго праяўленьнях, пад любой маскай.

ЦКК у ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі канцэнтравала галоўны агонь на вялікадзяржаўным шавінізме, нанесла бязьлітасны ўдар па іх кантрэтных носьбітах як у тэорыі, так і на практыцы. ЦКК у той-жа час бязьлітасна выкрывала і змагалася з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і яго агентурай — нацыянал-апартуністамі ў КП(б)Б, выкрыўшы іх буржуазна-нацыяналістычны здраднікі твар перад шырокімі масамі. ЦКК рашуча змагалася з шавінізмам усіх колераў і антысэмітызмам, мабілізуючы КП(б)Б на няўхільнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Нашай задачай ў далейшым павінна быць—яшчэ больш узмоцнена мабілізаваць пільнасьць нашай партыйнай арганізацыі на барацьбу за ленінскую нацыянальную палітыку, улічваючы, што галоўнай небясьпекай на даным этапе зьяўляецца ўхіл да вялікадзяржаўнага шавінізму. Партыйныя арганізацыі павінны памятаць словы тав. Сталіна, што «сутнасьць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму заключаецца ў імкненьні абыйсьці нацыянальную розьніцу: мову, культуру і быт; у імкненьні падарваць прынцып нацыянальнага роўнаправя і разьвянчаць палітыку па нацыяналізацыі апарату, нацыяналізацыі прэсы, школы і інш. дзяржаўных і грамадзкіх арганізацый». Разам з тым, мы ні ў якім выпадку не павінны аслабляць барацьбу з мясцовым шавінізмам, з беларускім контр-рэвалюцыйным нацдэмакратызмам, з яўрэйскім шавінізмам і з усімі рознавіднасьцямі нацыянал-апартунізму.

III. Праз бальшавіцкае выхаваньне--ліквідаваць хваравітыя зьявішчы

Да моманту XIII зьезду нашай партыі чыстка партыі ў асноўным была скончана.

За пэрыяд чысткі, замест 3.000 выключаных з радоў партыі, у партыю ўступіла 10.000 рабочых. Наша партыйная арганізацыя—КП(б)Б зьяўляецца здаровай, моцнай, бальшавіцка вытрыманай арганізацыяй і карыстаецца вялізарным аўтарытэтам. Аб гэтым гаворыць хоць бы той факт, што ў часе чысткі ў арганізацыю ўлілося 10.000 новых членаў, паміж XIII і XIV зьездамі КП(б)Б вырасла на 32 проц. У партыю ўступіла адных толькі рабочых 11.869 чалавек і больш 5.000 калгасьнікаў.

Калі прааналізаваць хваравітыя зьявішчы ў арганізацыі, дык і значна менш і зусім іншага характару, чым гэта было да чысткі.

Калі параўнаць 1929-1930 гады з чаргозымі гадамі, мы ўбачым, што ў 1929-30 г. прыцягнута ўсяго да партыйнай адказнасьці ў адносінах да агульнай колькасьці членаў нашай партыі 3,81 проц., а за пэрыяд 1930-31 г.—толькі 1,57 проц.

Па пытаньні аб выключэньні з партыі тое-ж самае. І тут процант некалькі нізкейшы, чым у папярэднія гады. Гэта сьведчыць, па-першае, аб зацярэньні партыі і палепшаньні работы КК у справе шырокага ўжываньня выхаваўчых мер у барацьбе з хваравітымі зьявішчамі.

Пасьля чысткі наша партыйная арганізацыя стала больш маналітнай, больш моцнай.

Партыйныя арганізацыі і органы КК павінны для часьпяховай барацьбы з нездаровымі зьявішчамі і непартыйнымі ўчынкамі перабудаваць сваю работу, узмацніць марксыцка-ленінскае выхаваньне. ЦКК, на працягу ўсяго пэрыяду перабудоўваючы сваю работу, ня толькі змагалася з хваравітымі ўчынкамі, а вывучала іх прычыны і ўжывала меры да іх папярэджаньня.

ЦКК, на аснове вывучэньня пытаньня аб удзеле камуністаў на вытворчасьці ў сацспаборніцтве і ўдарніцтве, прыняла пастанову, якая канкрэтызуе гэтую задачу, дае ўказаньні, як дабіцца яе рэалізацыі. Разглядае справы ў сьвятле тэй барацьбы, якую мы праводзім па пытаньні індустрыялізацыі краіны, па пытаньні разгорнутага будаўніцтва сацыялізму, падначальваючы гэтым галоўным задачам усю нашую работу КК. Таму натуральна, што мы павінны больш зьвязацца з вытворчасьцю. Пры разглядзе ўчынкаў камуніста неабходна выявіць, як ён сябе вядзе на вытворчасьці. Калі член партыі на вытворчасьці зьяўляецца перадавым, дык гэта ня справа, калі ён зьяўляецца членам партыі і ня прымае ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве, адстае і не жадае змагацца, гэта паказвае, што ён ня варты годнасьці камуніста.

Часамі ў раённых КК не заўсёды так падыходзяць. А, разглядаючы ўчынак члена партыі, ня зьвязваць яго з тым, што прадстаўляе сабою гэты член партыі і адсюль атрымліваецца, што члену партыі, які прымае актыўны ўдзел у вытворчасьці, зьяўляецца перадавым, даюць такое-ж партпакаранньне, як і таму, які акуратна плаціць членскія ўзносы, акуратна ходзіць на сходы, акуратна ідзе са сходаў, якому галава не баліць за справу партыі ў сэнсе барацьбы на працоўным фронце. Часамі ня робяць параўнаньня і падыходзяць з гэтага пункту гледжаньня. Мы павінны імёны падыходзіць так, зьвязваючы гэта з тым, як той ці іншы член партыі праводзіць лінію партыі на справе, на практыцы.

Партыйныя справы трэба разглядаць на самой партыйнай ячэйцы, на сходзе камуністаў дання прадпрыемства, данага цэху, данага калгасу, данай установы. Як правіла, член кантрольнай камісіі павінен зьявіцца для таго, каб прымаць удзел у гэтым сходзе, калі абгаварваецца пытаньне, для таго, каб дапамагчы разабрацца ў справе.

Іменна такая пастаноўка пытаньня будзе мець вялізарнае выхаваўчае значэньне, зьявіцца мерай папярэджаньня ў адносінах да членаў партыі.

Калі мы разглядалі партыйныя справы, атрымліваецца даволі часта капіяваньне работы савецкага суда. Пратаколы, допыты ў нас ёсьць вялізарнай таўшчыні. Каму гэта ўсё патрэбна, калі прасьцей разабраць усю гэту справу на партыйнай ячэйцы. Гэта не гаворыць за тое, што неабходна будзе апрымаць адпаведную лавецку і па дакументу, але ня трэба капіяваць таго, што робіцца ў судзе.

Я павінен яшчэ спыніцца на адным пытаньні—**на рабоце раённых кантрольных камісій.** Раённыя кантрольныя камісіі, якія праводзяць вялікую работу ў барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, ахоўваючы ад адзінства партыі, часамі падыходзяць да справы абсалютна няправільна. Як толькі член партыі зрабіў партыйны ўчынак, асноўнай задачай становіцца выключыць яго з партыі. Мы маем цэлы рад фактаў, калі, не разабраўшыся, кантрольныя камісіі выносілі абсалютна няправільныя рашэньні, потым нам прыходзіцца адпаўляць. У нас рад раённых КК яшчэ вельмі слаба разьбіраюць партыйныя справы, вельмі часта павархоўна, няўважліва падыходзяць да члена партыі, не вывучаюць, не праверяюць, як я ўжо вам даклядваў, яго справу аж да таго, што ў нас былі такія паасобныя выпадкі, калі КК арганізавала вобыск у члена партыі.

IV. Разгортваньне пралетарскай самакрытыкі

XIII зьезд КП(б)Б на пытаньні самакрытыкі канстатаваў, што ў радзе партыйных арганізацый самакрытыка разгорнута нездавальняюча, ня створаны адпаведныя ўмовы для сьмелага разгортваньня самакрытыкі.

Як стаіць справа зараз? Ва многіх партарганізацыях справа стаіць вельмі дрэнна. Напрыклад, справа рабкора Чапурэнкі. Ён батрак, камсамолец, вёў рашучую барацьбу супроць фактаў безгаспадарчасьці, антысэмітызму, сямейнасьці, чым закранаў кіраўнікоў саўгасу і сакратара парт'ячэйкі, якія, жадаючы пазбавіцца ад «надакучлівага» Чапурэнкі, стварылі супроць яго судовую справу па падставе сьвірна. Яго арыштавалі і пачалі сьледзіва на падставе ілжывых паказаньняў. Толькі ўмяшаньне камісіі ЦКК перашкодзіла асуджэньню гэтага селькора.

А вось справа з селькоркай Мясьнікавай, Межынскай арганізацыі. Селькорка Мясьнікова, зьяўляючыся актыўнай раборкай, на працягу вялікага пэрыяду часу ўскрывала праз друк усе недахопы партыйных і савецкіх раённых арганізацый, ускрывала факты п'янства і разлажэньня па асобных камуністаў за што падпала прасьледваньню адказнымі працаўнікамі аж да арышту. Па гэтай справе мы выключылі з партыі 2 чал. і прынялі да партыйнай адказнасьці.

Вельмі трубы заціск самакрытыкі быў у Барысаўскім раёне, калі выпушчаная газэта з правільнай крытыкай работы камперацыі выездам брыгады «Кооперативной жизни» была фактычна канфіскавана РК КП(б)Б па распараджэньні былога сакратара РК Сасноўскага. У Віцебску, ня гледзячы на некалькі пастаноў ЦКК аб тым, што на радзе прадпрыемстваў недобра з самакрытыкай, прасьледваньне рабкораў, пры праверцы работы Віцебскай партарганізацыі (да цяперашняга кіраўніцтва) быў выяўлены цэлы рад фактаў, якія гэта пацьвярджаюць.

Гэтыя факты заціску самакрытыкі, якія мелі месца, гавораць аб тым, што самакрытыка, як зброя барацьбы для паляпшэньня работы, далёка ня ўсімі арганізацыямі праводзіцца. ЦКК вяла бязьлітасную барацьбу з фактамі заціску самакрытыкі, памятаючы словы т. Сталіна, што самакрытыка «павінна ўзьняць палітычна-культурны ўзровень рабочай клясы, развіць у ёй пачуцьцё гаспадара, навучыць рабочую клясу справе кіраваць краінай».

Сьмелае разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі забясьпечыць сапраўдную далейшую мабілізацыю мас рабочай клясы і калгасьнікаў на праведзеньне генэральнай лініі партыі. Вялізарную ролю ва ўсёй барацьбе партыі з апартуністамі усіх розных адтенкаў і прымірэнцтвам да яго, за ажыцьцяўленьне баявых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва адыграў наш партыйны і савецкі друк і рабселькораўская армія, пад кіраўніцтвам партыі. Задача ўсёй КП(б)Б заключаецца ў тым, каб усямерна ўмацаваць гэту вострую зброю партыі, узьнімаючы на больш высокую ступень адказнасьць доўку і перабудоўваючы работу рабселькораўскай арміі паново.

V. За тэмпы, якасьць, праверку выкананьня

ЦКК-РСІ у барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі канцэнтравала сваю асноўную ўвагу на забесьпячэньні рэалізацыі цэнтральнага лёзунгу нашай партыі — **выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.**

XII і XIII зьезды КП(б)Б далі дырэктыву аб тым, што далейшае разьвіцьцё прамысловасьці павінна ісьці, галоўным чынам, па шляху далейшага паляпшэньня вытворчасьці, якое базуецца на мясцовых сырцовых рэсурсах. Шкодлівы, якія зьвілі сабе гняздо ў Дзяржпляне, працягваілі праз плянавыя дакументы ўстаноўку аб тым, што разьвіцьцё прамысловасьці павінна ісьці па лініі арганізацыі новых працаёмкіх вытворчасьцяй, як швэйная, панчошна-трыкатажная і г. д. Тарфяную праблему, пытаньні вырабу новых будаўнічых матар'ялаў, пытаньні мэталёпрамысловасьці—яны ўсяляк ігнаравалі.

ЦКК РСІ выкрыла ўсе гэтыя клясава-варожыя ўстаноўкі, якія ідуць у разрэз з выразнымі дырэктывамі ЦК і зьезду КП(б)Б, і ачысьціла апарат ад канкрэтных носьбітаў антыпартыйных установак у пытаньнях індустрыялізацыі БССР.

У 1931 годзе УсеКП(б), пад кіраўніцтвам ЦК, прыкладала ўсе намаганьні для таго, каб **узьняць ролю перадавых галін прамысловасьці,** ліквідуючы рэшткі шкодніцтва.

Наша асноўная задача была дабіцца сваячасова разгортваньня будаўніцтва.

Мы на працягу мінулага году правялі вялікую работу па барацьбе за апал.

Асноўнай прычынай прарыву па торфе зьяўляецца, зразумела, дрэнная работа торфазаводу, нізкі тэхнічны ўзровень і г. д. З боку нашых тарфяных арганізацый спажыўцоў торфу—ня было аддана той увагі тарфяному апалу, якое заслугоўвае гэта справа.

Тое самае мы мелі ў раёнах. Рад нашых раённых арганізацый не аддавалі той увагі гэтаму пытаньню, якая павінна была быць аддана. У выніку ўсяго гэтага, у выніку няўважлівасьці да вытворчай работы па здабычы торфу, у выніку недаацэнкі гэтай справы—праграма нявыканана.

Мы павінны даць адпор усім гутаркам аб тым, што торф, як апал, нікуды ня варты. Трэба па-баявому правесьці вывазку торфу, у першую чаргу для Белдрэс'у. Мы павінны в асаблівай сілай налегчы на палепшань не арганізацыі працы ў тарфяной прамысловасьці на аснове шасьці ўмоў тав Сталіна. Я павінен заявіць, што ЦКК РСІ прарабіла вялікую работу па торфе. Мы не абмежаваліся адным толькі кантролем, аднэй толькі распрацоўкай мерапрыемстваў, а непасрэдна прымалі ўдзел у ліквідацыі прарыву на Асінторфе і г. д. Але, відавочна, нашы меры, меры ЦК былі невыстарчальныя для таго, каб канчаткова ліквідаваць прарыў. Вурокі 1931 году павінны быць поўнасьцю ўлічаны. Нам была праведзена праверка якасьці прадукцыі па 400 прадпрыемствах.

Мы маем па радзе заводаў вялізарную колькасьць браку, псуем вялізарную колькасьць матар'ялаў, нясем вялікія страты.

Чаму ў нас такая вялікая колькасьць браку? Таму, што мы не зьвяртаем увагі на якасьць, не аддаем даволі ўваг гэтай важнейшай справе.

Цяпер нам жорстка пастаўлена пытаньне—дабіцца ва што-б там ні стала ў бліжэйшы час **значнага палепшаньня якасьці прадукцыі.**

Пра рацыяналізацыю вытворчасьці. Слаба займаемся мы гэтай справай, ня гледзячы на неаднаразовыя пастановы прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і ЦКК УсеКП(б).

Праўда, мы дабіліся некаторага зруху ў гэтай рабоце. Мы дабіліся складаньня рацыяналізатарскіх плянаў на прадпрыемствах, умацаваньня рацыяналізатарскіх кадраў, але эфэктыўнасьць усіх гэтых мерапрыемстваў яшчэ невыстарчальная. Плян рацыяналізацыі ўвогуле па Беларусі выкананы на 20 проц. Па паасобных заводах мы маем усё-ж вялікія дасягненьні. Па заводзе «Чырвоны Мэталіст» выкананьне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў на 74 проц. дало на працягу гэтага году 51.700 руб. эканоміі. Гарбарня ў Віцебску, якая выканала плян рацыяналізатарскіх прапаноў толькі на 68 проц., атрымала эканоміі 14.000 руб.

Завод імя Сталіна ў Магілеве, які выканаў гэты плян на 68 проц., таксама атрымаў эканоміі 197.000 руб. і г. д.

Наша задача—умацаваць гэты вагар выкананьня прамфінпляну, палепшаньня якасьці прадукцыі і ўнутрыпрамысловага накапленьня.

Наша задача—ва што-б там ні стала дабіцца зьмяншэньня і ліквідацыі страт. Гэта нам дасьць вялізарныя сродкі, патрэбныя для далейшага будаўніцтва.

Уся наша беларуская прамысловасьць не дадала дзяржаве прадукцыі, прыкладна, на 175 млн. руб. Горш за ўсё тое, што прарыў зажрануў у першую чаргу вядучыя галіны прамысловасьці—торф, будаматар'ялы, хімію, мэталь і г. д. Ня добра ў нас таксама з выкананьнем якасных паказьнікаў, са зьніжэньнем сабекошту. Усе нашы праверкі паказалі, што асноўнай прычынай невыкананьня пляну зьяўляецца не даволі актыўная, а месцамі зусім нічога ня вартая барацьба за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна.

Узяць хаця пытаньне рабочай сілы. Толькі на шасьці фабрыках мы маем лішак больш 2.100 чалавек. Але калі ўзяць усе галіны прамысловасьці—і ВСНГ, і Наркамснабу,—то тут будзе некалькі дзесяткаў тысяч. А што значыцца лішняя рабочая сіла ў вытворчасьці. Гэта значыцца, што мы ня можам укладацца ў фонды зарплаты. Па пытаньні перабудовы аплаты працы мы маем пералом. На радзе прадпрыемстваў праводзіцца простая зьдзельшчына, прагрэсыўна-прэм'яльная, але ёсьць яшчэ большыя хібы, большыя недахопы. Ёсьць факты, якія гавораць аб тым, што пасьля правядзеньня на адным заводзе прагрэсыўна-прэм'яльнай аплаты працы, ня толькі не дабіліся росту прадукцыйнасьці працы, але яна адносна зьнізілася (завод «Пралетары» і г. д.).

Чаму гэта так? Таму, што мы як відаць мала аддаем увагі рабоце тарыфна-нармовачнага бюро, і пры тым абсьледваньні, якое было праведзена намі сумесна з саветам прафэсыянальных саюзаў, устаноўлена, што тарыфна-нармовачнае бюро працуе дрэнна. На гэта трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу.

Пра гаспадарча-разрахунковыя брыгады і ўдзел камуністаў у сацспаборніцтве. Я прывяду па некаторых фабрыках процант удзелу членаў партыі і беспартыйных у сацспаборніцтве. На заводзе імя Варашылава процант ахопу сацспаборніцтвам членаў партыі да ўсіх членаў партыі складае 58,8 проц., а беспартыйных—75 проц. Фабрыка імя Клары Цэткін: камуністы—54,4, беспартыйных—68 проц. і г. д. Такое становішча зусім недапушчальнае. На 1 сьнежня мы мелі толькі 700 гаспадарча-разрахунковых брыгад. Чаму гэта так мала? Гэта тлумачыцца тым, што была блытаніна ў гэтым пытаньні, паасобныя кіраўнікі ВСНГ, прадпрыемстваў і аб'яднаньняў лічылі, што гаспадарча-разрахунковая брыгада і гаспадарча-разрахунковы цэх гэта тое самае, не разглядаючы гаспадарча-разрахунковую брыгаду, як вышэйшую форму арганізацыі сацыялістычнай працы. Такая недаацэнка гаспадарча - разрахунковых брыгад зусім недапушчальная.

Умацаваньне гаспадарчага разрахунку, яго пашырэньне—лепшы сродак кіраваньня і кантролю за выкананьнем пляну—павінна стаць баявой задачай УсеКП(б). Я ўпэўнены ў тым, што нашы гаспадарчыя, партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі, калі возьмуцца ўсе па-сапраўднаму за выкананьне шасьці ўмоў тав. Сталіна, плян 1932 году будзе выкананы поўнасьцю.

Па чыгуначным транспарце асноўная наша задача зводзілася да таго, каб правесьці ў жыцьцё пастанову ЦК КП(б)Б па гэтым пытаньні. Мы яшчэ маем вельмі многа зрываў спаранай ямы.

Дрэнна ў нас з рамонтам паравозаў і вагонаў. У Жлобінскім раёне, у мінулым годзе, як толькі стаў паравоз на рамонт, прападалі дэталі яго. Паравоз здаровы, моцны, але яго не маглі пусьціць у работу, бо ня было той ці іншай часткі.

Наша асноўная задача на чыгуначным транспарце—ва што-б там ні стала **выявіць тыя захаваныя рэзэрвы, якія ёсьць на транспарце і такім чынам палепшыць работу. Калі мы даб'ёмся павялічэньня работы паравозу на адну гадзіну ў суткі, павялічэньня эфэктыўнай работы вагона і г. д., мы зробім вялікую справу.**

ЦКК РСІ рашучым чынам змагалася за выкананьне дырэктыў партыі па транспарце. Нашай задачай на далейшае, як і задачай ўсёй КП(б)Б, зьяўляецца канчатковае зьнішчэньне бюракратызму і коснасьці ў перабудове работы на транспарце, у яго сацыялістычнай рэканструкцыі.

Па сельскую гаспадарку. Тав. Шаранговіч падрабязна пра гэта гаварыў. Я спынюся толькі на некаторых пытаньнях.

Аб барацьбе са стратамі. Страты набываюць вялізарныя разьмеры. Пры такім становішчы, калі ў нас будуць такія вялікія страты, мы не даб'емся сур'ёзных арухаў. Трэба дабіцца спыненьня гэтых страт, у першую чаргу жывёлагадоўлі.

Па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. ЦКК правяла спэцыяльную праверку арганізацыйна-гаспадарчага стану калгасаў. Гэта праверка паказала, што ня ўсе нашы калгасныя ячэйкі і раённыя партыйныя арганізацыі па-сапраўднаму мабілізавалі сябе і калгасныя масы на барацьбу з кулаком, які прабуе падарваць калгасы з сярэдзіны. Арганізацыя працы ў калгасах нездавальняючая. Калгасы «Чырвоная ворка», «Іскра

Сацспаборніцтва-пераклічка перадавых раёнаў СССР

Пераклічка-спаборніцтва перадавых раёнаў — справа ўсіх саветаў БССР

Падрыхтоўка да ўсесаюзнага зьлёту ў Сінельнікаве павінна праходзіць пад адзнакай упартай работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, выкананьні плянаў загатовак і падрыхтоўкі да бальшавіцкай вясны

Разгортваючы спаборніцтва паміж саветамі і калгасамі, Мсьціслаўскі раён павінен апраўдаць свае ўключэньне ў вядучыя раёны і выйсьці пераможцам ва ўсесаюзным спаборніцтве

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, 28 студзеня 1932 году, вынес спэцыяльную пастанову аб Усесаюзным спаборніцтве—пераклічцы вядучых раёнаў СССР па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і правядзеньні веснавой сяўбы.

Прэзыдыум даручыў Мсьціслаўскаму РВК і раённым арганізацыям зараз-жа разгарнуць масавую работу і падрыхтоўку да нарады ў Сінельнікаве. Наркаматам і цэнтральным арганізацыям прапанавана аказаць канкрэтную дапамогу Мсьціслаўскаму раёну і вылучыць адказных работнікаў для пасылкі ў раён.

Рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» прапанавана арганізаваць выязную рэдакцыю ў Мсьціслаўскі раён і сыстэматычна асьвятляць на старонках газэты ход пераклічкі-спаборніцтва. На зьлёт брыгад перадавых раёнаў, у Сінельнікава камандыруецца загадчык аргінстру прэзыдыуму ЦВК тав. Хіламонаў і прадстаўнік рэдакцыі «Савецкая Беларусь».

Ад камісіі па падрыхтоўцы зьлёту перадавых раёнаў

Камісія па падрыхтоўцы зьлёту вядучых раёнаў, вылучаных для ўдзелу ва Ўсесаюзнай вытворчай пераклічцы-спаборніцтве, паведамляе:

Адчыненьне зьлёту адбудзецца ў гор. Сінельнікаве (УССР) 10 лютага а 7 гадзіне ўвечары.

На станцыі Сінельнікава Паўднёвых дарог, пачынаючы з 9 лютага дзяжурыць пост камісіі і «Известий» па прыёме дэлегатаў, выдачы мандатаў і дастаўкі дэлегатаў у інтэрнат.

З мэтаю арганізаванага прыёму дэлегацый камісія просіць у дзень выезду тэлеграфаваць Сінельнікаўскаму райвыканкому склад дэлегацый і № цягніка, а ў выпадку перасадкі ў дарозе—нумар апошняга цягніка.

Усе раёны, якія ўдзельнічаюць у зьлёце, павінны выслаць з нарочным матар'ялы для выстаўкі.

Старшыня камісіі БОРШЧ.
Члены камісіі: АРЦЁМЕНКА, ПАДАЛКА, КУНІК, СТАНЬКО, ФЭСЭНКА, ГОТЛІБ.

Разгортваецца падрыхтоўчая работа да зьлёту ў Сінельнікаве

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Ад нашага спэцкарэспандэнта). У раёне разгарнулася шырокая работа па падрыхтоўцы да Ўсесаюзнага зьлёту ўдзельнікаў пераклічкі-спаборніцтва перадавых раёнаў СССР, які адбудзецца 10 лютага ў гор. Сінельнікаве (УССР).

23 студзеня адбылося паседжаньне фракцыі РВК разам з налўнымі членамі бюро РК КП(б)Б і прэзыдыуму РВК, а 24—нечарговае паседжаньне бюро райкому КП(б)Б па пытаньнях уключэньня Мсьціслаўскага раёну ва Ўсесаюзнае спаборніцтва-пераклічку. Бюро РК КП(б)Б прыняла спэцыяльную пастанову, у якой вітаецца арганізацыя пераклічкі спаборніцтва і намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па разгортваньні гэтага спаборніцтва. У сельсаветы і калгасы раёну паслана звыш 200 чалавек у тым ліку: з Усебеларускай калгаснай школы рахункаводаў—20 ч., з курсаў калгасных кадраў—45 ч., камсамольцаў—40 чал., саматужнікаў—20 чал., па лініі райпрафсавету—20 чал. і адказных раённых работнікаў каля 40 чал.

Раённая канфэрэнцыя настаўнікаў абвесьціла сябе мабілізаванай на правядзеньне падрыхтоўчай работы па пераклічцы і ў поўным сваім складзе выехала ў сельсаветы. Уся работа праводзіцца пад кутом погляду неадкладнага зьнішчэньня ўсіх маючых прарываў, канчатковага разьмеркаваньня прыбыткаў ва ўсіх калгасах, поўнага выкананьня плянаў лёна і пеньказагатовак (да 5 лютага), узьняцьця арганізацыйна-масавай работы саветаў і работы пізавога друку.

У большасьці сельсаветаў адбыліся нарады савецкага і калгаснага актыву, а 29 і 30 студзеня адбудуцца куставыя нарады сельсаветаў і калгаснага актыву па пытаньнях ліквідацыі прарываў у выкананьні гаспадарча-палітычных заданьняў і падрыхтоўкі да зьлёту ў Сінельнікаве. 4 лютага ў Мсьціслаўлі адбудзецца раённы зьлёт партыйнага, савецкага і калгаснага актыву, на якім будуць аб'яўлены вынікі папярэдняй работы і абрана дэлегацыя для паездкі на зьлёт у Сінельнікава. Калгаснікі і беднякі-сераднякі-адпаасобнікі рыхтуюць да дню раённага зьлёту чырвоныя абозы лёну, пянькі, збожжа.

РК КП(б)Б, РВК і РК ЛКСМБ сумесна з рэдакцыяй «Бальшавіка Мсьціслаўшчыны» зьвяртаюцца са спэцыяльнай адозвай да ўсіх партыйных, савецкіх, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый, у якой заклікаюць змагацца за канкрэтныя лічбы перамог у выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных заданьняў і падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі.

С. Громаў.

Чарговы адказ ад Забалоцкага сельсавету

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь"

Мсьціслаў каму РК КП(б)Б і РВК

Рапарт

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі Хадасоўскі сельсавет, Мсьціслаўскага раёну, на аснове разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва закончыў 3-ці рашаючы год пяцігодкі з наступнымі дасягненьнямі: да 1 студзеня 1932 году калектывізавана 756 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, што складзе 81,5 проц. усіх гаспадарак сельсавету.

План мабілізацыі сродкаў 4-га кварталу выкананы на 101,8 проц.

План збожжазагатовак выкананы на 129 проц.

План загатоўкі лёнавалакна выкананы на 75 проц.

Уся работа калгасаў пераведзена на зьдзельшчыну, скончана разьмеркаваньне ўраджаю.

Нечарговая нарада ўсяго актыву Хадасоўскага сельсавету, у ліку 70 асоб разам з ударнікамі калгасаў, абмеркаваўшы пытаньне аб Усесаюзнай пераклічцы-спаборніцтве перадавых раёнаў СССР, ухваляе ініцыятыву Сінельнікаўскага раёну і вітае тэлеграму старшыні БССР тав. Чарвякова.

Хадасоўскі сельсавет уключаецца ва Ўсесаюзную пераклічку і выклікае Забалоцкі сельсавет, Мсьціслаўскага раёну на сацспаборніцтва па лепшым выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных задач. Нарада актыву сельсавету пастанаўляе правесьці спаборніцтва-пераклічку ўсіх калгасаў сельсавету, арганізаваць спробныя выезды падрыхтоўкі да весновой сяўбы.

Хадасоўскі сельсавет запэўнае партыю і ўрад, што будзе па-бальшавіцку змагацца за перамогу Мсьціслаўскага раёну ў пераклічцы-спаборніцтве

Па даручэньні нарады сакратар сельпарткому ЛОГІНАЎ.
Старшыня сельсавету ВЫСОЦКІ.
Прадстаўнік РВК ВЫБАРНЫ.
Прадстаўнікі калгасаў ТАЎКАЧОЎ і ЕРМАКОЎ.

ФІНПАХОД

Поўнае ўжываньне 6 умоў тав. Сталіна

гарантуе пасьпяховае выкананьне фінансавага пляну

ЖЫВЫ УДЗЕЛ ШЫРОКІХ МАС ПРАЦОЎНЫХ ВЫРАШАЕ СПРАВУ

Фінпаход разгортваецца ўсё шырэй і шырэй. Але дагэтуль яшчэ па радзе раёнаў ёсьць вялікае адставаньне ў выкананьні фінпляну.

Зьмяшчаныя сёньня матар'ялы яскрава гавораць за тое, што галоўнейшай прычынай адставаньня ў выкананьні фінпляну зьяўляецца адсутнасьць шырокай масавай работы, невыкананьне 6 умоў тав. Сталіна, кіраўніцтва «па-старыцы», нежаданьне ўжываць новыя мэтады і формы работы.

Папяровае кіраўніцтва, чыноўніцкія адносіны да справы,—вось яшчэ адна прычына.

Апартунізм, апартуністычныя адносіны да справы фінансаў, да справы правядзеньня генэральнай лініі партыі ў гэтай галіне — вось як трэба кваліфікаваць «работу» па выкананьні фінпляну ў адсталых раёнах.

Гэтыя раёны не жадаюць лічыцца з указаньнямі тав. Сталіна аб тым, што справу вырашаюць жывыя людзі, яны ня лічацца з тым, што толькі шырокі ўдзел працоўных мас у фінансавай рабоце дасьць посьпехі ў яе выкананьні.

Жывыя людзі, рабочыя, калгаснікі забываюцца бюракратамі, якія імкнуцца падмяніць удзел шырокіх працоўных мас у фінсправе сухімі паперкамі.

Адсюль—адставаньне у выкананьні фінпляну, адсюль—прарывы.

І каб ня было адставаньня, прарываў—трэба забясьпечыць шырокі, практычны, штодзённы ўдзел працоўных у справе, трэба весьці шырокую масавую работу, трэба жорстка пакараць тых, хто не жадае выконваць паказаньняў партыі і ўраду ў гэтым напрамку.

Надаць бальшавіцкія тэмпы выкананьню фінпляну

Ворша. Першы маршрут фінпаходу скончыўся. Аршанчына да фінпляну першага маршруту прыйшла з ганебным прарывам. На 20 студзеня фінплян выкананы толькі на 30,7 проц.

Прарыў галоўным чынам тлумачыцца тым, што справе мабілізацыі сродкаў з першых дзён 4-га заключнага году пяцігодкі ня былі нададзены неабходныя бальшавіцкія тэмпы, што, нават, штаб фінпаходу быў складзен са спазьненьнем на два тыдні. У галовах работнікаў фінансава-банкаўскага апарату існуе апартуністычная думка, што, студзеньскі плян немагчыма выканаць, «бо няма старой запазычанасьці».

Гэтыя адносіны прывялі да таго, што па галоўных аб'ектах, як пазыка «3-ці рашаючы» фінплян выкананы на 26 проц., паі па Райсаюзе—на 4,5 проц., прыбытковы падатак—на 20 проц. Па ўкладах фізычных асоб у ашчадкасу ёсьць, нават, адліў.

Да апошніх дзён райфа наогул ня мела поўнага пляну мабілізацыі сродкаў па сыстэме каапэрацыі і на 21 студзеня ня мае пляну па ТПО, тарфяной каапэрацыі і радзе іншых аб'ектаў.

Масавая работа вакол выкананьня фінпляну не разгорнута—пасты трывогі існуюць на паперы, камісіі ў работу па мабілізацыі сродкаў ня ўцягнуты.

Аршанчына мае вопыт перамогі на фінансавым фронце ў мінулым годзе.. Такіх-жа перамог можна і неабходна дабіцца і зараз, бо фінплян першага кварталу па раёне зусім рэальны. Неабходна толькі разгарнуць вакол выкананьня фінпляну сапраўдную масавую работу, уцягнуць у мабілізацыю сродкаў фінармейцаў, рабочых, служачых і працоўных.

Другі маршрут фінпаходу павінен даць крупы пералому у справе мабілізацыі сродкаў па Аршанчыне. Трэба дабіцца, каб да XVII Усесаюзнай парт канфэрэнцыі выкананць 50 проц. квартальнага заданьня фінпляну. (Белта).

Барысаўшчына арывае фінпляну

Да адказнасьці арыўшчыкаў

БАРЫСАЎ. (Белта). Квартальны плян мабілізацыі сродкаў па Барысаўшчыне выкананы на 21 студзеня толькі на 17,4 проц. Заданьне па разьмяшчэньні пазыкі «3-га рашаючага» і ўкладах у ашчадкасы толькі на 15,4 проц.

Ганебнае адставаньне Барысаўшчыны тлумачыцца анартуністычнымі адносінамі да справы выкананьня фінпляну з боку мясцовых фінансавых і прафсаюзных арганізацый.

Зусім нездавальняюча ідзе выкананьне фінпляну па абавязковых пазыках. Квартальнае заданьне выкананa на 13,1 проц. Заданьне па страхоўцы выкананa на 15,7 проц., сельгаспадатак,—14,4 проц. і самаабкладаньне на 6,7 проц.

Права на рапарт 14-му зьезду КП(б)В Барысаўскі раён не заваяваў.

Неабходна павесьці фанучую барацьбу за выкананьне фінпляну 1-га кварталу. Раённы штаб фінпаходу павінен па бялвому ўзяцца за работу.

БАРЫСАЎ. (Белта). Некалькі тысяч падпісчыкаў дзяржпазык рабочых барысаўскіх прадпрыемстваў ня ўчэ на сёньняшні дзень не апрымалі аблігацый, а таму ня ўдзельнічаюць у тыражох 3-й пазыкі індустрыялізацыі і «пяцігодка ў чатыры гады».

Толькі гэтымі днямі адміністрацыя фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» здала дзяржбанку на хаханьне аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі, якія ў свой час ня былі раздаены рабочым. Ёсьць не разданыя аблігацыі і па першым выпуску «пяцігодка ў чатыры гады». Па заводзе імя Домбаля таксама ня ўсім рабочым раздаены аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Несвалачасовую раздачу аблігацый падпісчыкам нельга інакш кваліфікаваць, як шкодніцкія адносіны да справы дзяржкредыту. Гэтай справай павінна зацікавіцца пракуратура і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

З 5 па 20 лютага абвяшчаецца штурм праверкі гатоўнасьці да сяўбы

Усім загадчыкам райза і старшыням райкалгассаюзаў

Папярэдняя праверка ходу загатовак насеньня, засыпкі насенных фондаў і падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, паказвае бязьдзейнасьць апарату Райза і райкалгассаюзаў у гэтай справе. Значная частка калгасаў, асабліва ў раёнах Слуцкім, Мсьціслаўскім, Капыльскім, Чырвонаслабоцкім, Магілеўскім — да гэтага часу яшчэ не абмалаціла кармовых траў (канюшыну, цімафейку, сэрадэлю, лугавыя травы), кораньплодаў і гародніх культур, што зрывае загатоўку насеньня і засыпку насенных фондаў.

Як у раёне, так у саўгасах, калгасах і МТС ня вылучаны адказныя асобы па абмалоце, ачыстцы, захаваньні, адачы і засыпцы насеньня.

МТС амаль што спынілі абмалот паказаных культур.

Пад вапу асабістую адказнасьць прапануем зараз-жа мабілізаваць малатарні, канюшынныя пёркі, сартаройкі раёну, МТС, саўгасаў і пры недахопе цёрак трэба прыстасаваць для гэтага малатарні. Неабходна арганізаваць брыгады па абмалоце, на працягу 5 дзён вылучыць адказных асоб па абмалоце ў калгасах, саўгасах, МТС, сельсаветах і па працягу 2 дзён скончыць абмалот, ачыстку і адачу насеньня.

Абвясьціць з 5 па 20 лютага штурм загатоўкі і праверкі наяўнасьці насеньня, мабілізаваўшы ўвесь апарат Райза, Райкалгассаюзаў, загатоўчых арганізацый для пасылкі на месца ў калгасы, саўгасы, сельсаветы.

Аб выкананьні вышэй адзначанага і прынятых вамі мер паведаміць НК Зем і Калгасцэнтр да 10 лютага г. г.

Наркамземіраробства Рачыцкі.
Старшыня Белкалгасцэнтру Міцькоў.

Па БССР

Пленум акадэмічнага савету БАН

На апошнім паседжаньні Пленуму Акадэмічнага Савету Беларускай Акадэміі Навук разгледжаны паміж іншым наступныя пытаньні: зацьверджаны плян прац навукова-дасьледчых Інстытутаў Акадэміі на 1932 г. У спрэчках па гэтым пытаньні выказаўся цэлы рад акадэмікаў і навуковых працаўнікоў. Плян працы Інстытутаў на 1932 год прыстасаваны да выкананьня 6 умоў тав. Сталіна ў навукова-дасьледчай працы ў БССР. 1932 год зьяўляецца першым годам, калі Інстытуты Акадэміі будуць праводзіць сваю працу строга плянава, прыстасаваўшы свае работы да патрэб сацыялістычнага будаўніцтва.

Пленум прапанаваў Прэзыдыуму Акадэміі надрукаваць пляны прац на беларускай, расійскай і нямецкай мовах для азнаямленьня з імі шырокай грамадзкасьці Савецкага Саюзу і з тымі пытаньнямі і праблемамі, над якімі працуе ў сучасны момант абноўлены калектыў навуковых працаўнікоў Беларускай Акадэміі Навук.

Пленум таксама прапанаваў Прэзыдыуму і ўсім дырэктарам інстытутаў Акадэміі падрыхтаваць матар'ялы аб працы кожнага інстытуту з тым, каб выдаць зборнік дасягненьняў навукі ў БССР да XV-годзьдзя Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Зборнік павінен выйсьці не пазней як за паўтара месяца да Кастрычніцкіх сьвят. Акрамя гэтага пленум прызнаў неабходным выданьне «Запісак» Акадэміі, праз якія шырокая грамадзкасьць ведала-б аб штодзённай працы БАН.

На гэтым-жа паседжаньні Пленум БАН зьвярнуўся з прывітальнай тэлеграмай да XIV Зьезду КП(б)Б і XVII Канфэрэнцыі УсеКП(б), у якой гаворыць, што пад кіраўніцтвам ЦК і на падставе ліста т. Сталіна, у рашучай барацьбе за марксыцка-ленінскую мэтадалёгію навуковыя працаўнікі Беларускай Акадэміі Навук будуць змагацца за далейшае разьвіцьцё навукі і беларускай культуры, сацыялістычнай па сваім зьмесьце і прыкладаць усе сілы, каб навуковыя дасягненьні Акадэміі зрабіліся здабыткам шырокіх рабочых і калгасных мас.

Пленум зацьвердзіў дагавор па сацспаборніцтву паміж Акадэміямі СССР УССР і БССР і даручыў ад імя Пленуму падпісаць яго т т. Горыну, Панкевічу і Кролю.

Шпілеўскі.

Выпрацоўка паперы на Добрусной фабрыцы пачала расьці. З 26 проц. дзённага заданьня, фабрыка дае на 29 студзеня—65,7 проц., на 27 студзеня—67,3 проц. і на 28 студзеня—75,5 проц. 29 студзеня былі пушчаны яшчэ дзве машыны. Такім чынам, фабрыка працуе 5-ю машынамі.

Новая рабочая сталоўка адчынена Віцебскай фабрыкай «Дзьвіна».

Завод «Чырвоны Мэталіст» (Віцебск) прыступіў да выробу жалезных кузавых трамвайных брыкетных вагонаў. Драўляная часьціна гэтых вагонаў будзе выраблятца на дрэваапрацоўчых заводах Віцебску. Першы брыкетны вагон будзе пушчаны 1 кастрычніка 1932 году.

Інжынэрна-тэхнічны пэрсанал фабрыкі «Дзьвіна» правёў у жыцьцё рад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў. Паміж іншымі мерапрыемствамі—скарочаны працэс кора-машыны. Гэта дае лепшае скарыстаньне валакна на 3.000 руб. у год і памяншае на 50 проц. патрэбы рабочай сілы.

Прэзыдыум ЦВК БССР, з мэтай ўцягненьня самых шырокіх мас працоўнага насельніцтва ў справу ажыцьцяўленьня пастаноў 2-й сэсіі ЦВК Саюзу ССР VI скліканьня і II сэсіі ЦВК БССР X скліканьня, даручыў райвыканкому і саветам распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па папулярызацыі гэтых пастаноў з тым, каб на падставе ўцягненьня ў гэту справу шырокіх працоўных мас забясьпечыць пасьпяховае выкананьне ўсіх задач 4-га завяршаючага году пяцігодкі.

Усе наркаматы і цэнтральныя ўстановы БССР павінны ў 2-х дзённы тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні пастаноў сэсіі ЦВК СССР і БССР.

Прэзыдыум ЦВК заслухаўшы паведамленьне Аргінстру аб правядзеньні справаздачнай кампаніі саветаў і падачы РВК і гарсаветамі адпаведных справаздачных вынікаў гэтай кампаніі адзначыў, што па радзе раёнаў справаздачная кампанія была зацягнута, і тэрміны ўстаноўленыя прэзыдыумам РВК парушаны. Значнай часткай РВК не складзены вынікі справаздачных кампаній. Жлобінскі і Гомельскі гарсаветы даручылі вызначаньня тэрміны правядзеньня справаздачнай кампаніі. Прэзыдыум ЦВК прапанаваў РВК і гарсаветам, якія яшчэ да гэтага часу не падалі справаздачных матар'ялаў, зараз іх падаць.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Гукавое кіно тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня — Першая гукавая камэдыя Мэханічны здрадник у гал. ролі Ігар Ільінскі

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз. — ЦІХІ ДОН У галоўнай ролі Цэсарская

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — 3-я МЯШЧАНСКАЯ (каханьне ў траіх) Пачатак а 2 гадзіне дня

5-га лютага 1932 году
БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
СКЛІКАЕ НАРАДУ
ПА ПЫТАНЬНІ:
Уплыў кліматычных умоў зімы на становішчы пасеваў і выпрацоўка практычных мерапрыемстваў па захаваньні і ўзьняцьці ўраджайнасьці.
ПАВЕСТКА ДНЮ НАРАДЫ:
1. Становішча азімых у сучасны момант (даклад зональна-збожжавай станцыі).
2. Кліматычныя ўмовы зімы і іх уплыў на ўраджайнасьць (даклад праф. Кайгародава).
3. Біялёгічныя ўмовы перазімоўкі сельгаспасьлін (даклад праф. Максімава).
4. Глебавыя ўмовы ў комплексе прычын вымаканьня азімых культур (даклад акад. Афанасьева).
5. Выпрацоўка мерапрыемстваў па ахове і ўзьняцьці ўраджайнасьці.
НА НАРАДУ ВЫКЛІКАЮЦЦА:
прадстаўнікі зональнай станцыі збожжавых і бабовых культур, Гідрамэтінстытуту, НКЗ БССР, Калгасцэнтру, саўгастрэсту, ад сельгасву аў Горак і прадстаўнікі інстытуту БАН, Біялёгічнага агра-глебівага, фізыка-тэхнічнага і ад усесаюзнага інстытуту рэсьлінаводзтва прафэсар Максімаў, Н. А., ад Інстытуту сацыялістычнай рэканструкцыі.
НАРАДА ПАЧЫНАЕЦЦА а 12 гадз. раніцы
у ЗАЛІ БАН (рог Ленінскай і Ўніверсытэцкай, будынак БАН, другі паверх).
ПРЭЗЫДЫУМ БАН

7 лютага, а 6 гадзіне ўвечары, у клюбе харчавікоў
СКЛІКАЕЦЦА
ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД Т-ва ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ БССР
З НАСТУПНАЙ АБВЕСТКАЙ ДНЮ:
1. Даклад аб міжнародным і ўнутраным становішчы і аб чарговых задачах Саюзу Т-ваў Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяцу ССР.
2. Справаздачны даклад ЦК Т-ва Чырвонага Крыжу БССР і сакладклад рэвізыйнай камісіі Т-ва.
3. Зацьверджаньне статуту Т-ва Чырвонага Крыжу БССР.
4. Зацьверджаньне кантрольных лічбаў на 1932 г. і выкананьне каштарысу за 1931 год.
5. Выбары ЦК Т-ва Чырвонага Крыжу і Цэнтральнай Рэвізыйнай Камісіі.
Прэзыдыум ЦК Т-ва Чырв. Крыжу БССР

ПРЫ КЛІНІЧНЫМ ГАРАДКУ БЕЛМЭДІНСТЫТУТУ
ФУНКЦЫЯНІРУЮЦЬ
клінікі тэрапіі, акуш-гінеколёгіі, скурна-вэнэрычная і стамотолёгічная
ПРЫЁМ ХВОРЫХ У КЛІНІКІ ВЫТВАРАЕЦЦА ПРАЗ ЭВАКАПРЫЁМНІК
за выключэньнем хірургічных і акуш-гінеколёгічных, якія накіроўваюцца ў клінікі непасрэдна гарздравамі і райздравамі з папярэднім запытаньнем толькі адпаведнай клінікі.
Дырэкцыя Клінічнага Гарадку

ЗАВОЧНЫ ПЭДІНСТЫТУТ (УНІВЭРСЫТЭЦКІ ГАРАДОК)
СКЛІКАЕ з 10-II па 1-III 32 г. ЗАЛІКОВУЮ СЭСІЮ
На сэсію выклікаюцца студэнты 2-га курсу і прыёму 1930 году
Зьявіцца на сэсію павінны толькі тыя завочнікі, якія атрымалі пэрсанальныя паведамленьні.
Завочны Пэдінстытут

Рэдакцыі газэт „Савецкая Беларусь" і Рабочий", Белжылсаюз, ГарКК-РСІ і Гарадзкі Савет
СКЛІКАЮЦЬ 4-га лютага 1932 г.
АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ
праўленьняў рэўкамісій згадамамі ЖАКТаў і ЖБКТ і сэктароў, існуючых пры праўленьнях каапэратываў, разам з рабочымі і служачымі рамонтнай канторы і Гаржылсаюзу.
НАРАДА АДБУДЗЕЦЦА а 7-й гадзіне ўвечары
ў памяшканьні клюбу Гарсавету (Пляц Волі) з наступным парадкам дня:
1. Аб правядзеньні агляду-праверкі выкананьня Мінгаржылсаюзам пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб палепшаньні гарадзкой і жыльлёвай гаспадаркі г. Менску.
2. Аб ходзе фінпляну.
Пасьля нарады мастацкая частка.
У зьвязку з важнасьцю пытаньняў,—яўка ўсіх выклікаемых абавязковая.

СЭКТАР КАДРАЎ „ОРУ"
АРГАНІЗУЕ 6-ці МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ
па падрыхтоўцы бухгальтароў для заводаў Белдзяржсьпірту.
Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй 100 руб. у месяц.
Кватэрамі не забясьпечваюцца. Пасьля сканчэньня курсаў павінны працаваць на раёне на заводах Белдзяржсьпірту 2 гады.
На курсы прымаюцца рахункавыя працаўнікі са стажам рахункавода ня менш 1 году. Да заяў даданьні: 1) пасьведчаньне аб адукацыі (7 гр.), 2) аб сацыяльным становішчы, 3) аб стажу, а калгаснікі — згоду свайго прадпрыемства.
Заявы прымаюцца да 5-га лютага 1932 году.
Адрас: Менск, Савецкая, 55, уваход у варот.

ЗГУБЛЕНЫ:

Пасьведчаньне аб скончэньні пяцігодкі Чэрнякова А. Н., выд. 1 Мсьціслаўскай 7-мі годкай за № 114, кв. 1416-п.

Вайсковы білет выд. Віцебскім ваенкаматам Часко С. П., кв. 1411-п.

Вайсковы білет Шабіборкіна Т. К., выд. Горацкім ваенкаматам, кв. 1403-п. Згарэла вучотная кніжка і вайсковая асабовая картачка за № 19799/2 Хромава А. С., кв. 1403-п.

Партбілет Сурдова Д. І., выд. Віцебскім райкомам КПБ за № 1301857, кв. 1403-п.

ПАПРАЎКА
У аб'яве аб новым часопісу „Кніга масам", зьмешчанай у газ. „Савецкая Беларусь", № 11 ад 13 I г. г. надрукавана ва ўмовах падпіскі на год—3 руб. 50 кап.
тэрэба чытаць 2 руб. 50 к.

ЗГУБЛЕНА вялёт - абавязковасьці ства серыі № 88562, па якому ўнесена 118 руб. на імя КОСЬЦІНА Л. М., лічыць недапраўдным

ЗГУБЛЕНА дамавая кніга дому Кашынскай К., лічыць несапраўднай

Даведка аб сацыяльным становішчы Антонава В. І., выд. Петрыкаўскім гарсаветам, пасьведчаньне аб адукацыі выд. 2 Петрыкаўскай сямігодкай, квіт аб пераводзе з МЦРК ў ВЦРК на аванс 17 р. 40 к., выд. пасным стадам МЦРК, асабовае пасьведчаньне выд. Петроўскай гарміліцыяй, кв. 1412-п.

Членскі білет Дмітрачэнка П. Д., выд. Саюзам МТС, кв. 1403-п.

Членскі білет Новікава, выд. Горацкім саюзам будаўнікоў, кв. 1403-п.

Камсамольскі білет Драздова М. А., выд. Горацкім райкамолам за № 252946, кв. 1403-п.

Прафсаюзны білет Бляхера С. А., выд. Горацкім мясцкомам каапрацоўнікаў за № 4246, кв. 1403-п.

Згублены чэкі Кандрацьева В. В. за № 85276 на 40 р. 36 к. і 85227 на 35 р., выд. саўгасам № 56.

Пашпартная бестэрміновая кніжка Хасанова П. М. Растоў/Дон., гарміліцыяй № 2799, кв. 1403-п.

Вайсковы білет Карпава М. П., выд. дрыбінскім РВК і конская картка № 618, кв. 1403-п.

Украдзена пасьведчаньне Крачэнка З. П., рахункаводных курсаў і пасьведчаньне Горацкай РКІ, кв. 1403-п.

Членскі білет Гладкоўскага В. А., выд. Аршанскім акрывкомам, выд. за № 122892, кв. 1403-п.

Упаўнаваж. Галоўлітбел. № А—53.
Друкарня імя Сталіна.